WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 ЛІПЕНЯ 2010 г. ЧАЦВЕР № 136 (26744)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

## КАЛІ ЯЗВА АБВАСТРЫЛАСЯ І «ДАСТАЎ» ПАНКРЭАТЫТ...

На нашай чарговай «прамой лініі» мы пагаворым пра хваробы страўнікава-кішачнага тракту, такія як язвы, гастрыты, панкрэатыты і іншыя. Вы зможаце задаць пытанні **дацэнту 2-й кафедры ўнутраных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Мікалаю Валянцінавічу КАПРАЛАВУ,** а таксама **дацэнту гэтай жа кафедры, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Ірыне Аляксандраўне ШАЛАМІЦКАЙ.**

***«Прамая лінія» адбудзецца 22 ліпеня, у чацвер, з 14.00 да 15.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 287 18 36 і 287 18 29.***

## Для неплацельшчыкаў паслуг ЖКГ прадугледзяць прымусовы абмен, а для ўласнікаў — продаж жылля на аўкцыёнах

Сяргей КУРКАЧ

**УЧОРА на пасяджэнні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты разглядалі праект новага Жыллёвага кодэкса нашай краіны. У Беларусі істотна змяніліся сацыяльна-эканамічныя ўмовы, таму наспела неабходнасць падкарэктаваць існуючыя нормы жыллёвых адносінаў, адзначыла старшыня камісіі Галіна ПАЛЯНСКАЯ.**

У праекце новага кодэкса з'явіліся раздзелы аб прыватным жыллёвым фондзе, аб дадатковым рэгуляванні жыллёвых адносінаў асобных катэгорый грамадзян, такіх як дзеці-сіроты, непрацаздольныя, абавязаныя асобы. У новую рэдакцыю Жыллёвага кодэкса ўвайшлі нормы ўказаў аб долевым будаўніцтве, аб сумесным домаўладанні і прыватызацыі. Дакумент будзе дасканала рэгуляваць структуру аплаты камунальных паслуг. Гэта вельмі важны момант, бо сёння спажывец не заўсёды ведае, якія работы і ў якіх аб'ёмах прадугледжваюцца пад графой «тэхабслугоўванне». Новы Жыллёвы кодэкс патрабуе дасканала «раскрываць» усе пазіцыі па тэхабслугоўванні — каб спажыўцы ведалі, за што і колькі яны плацяць.

Галіна Палянская паведаміла, што ў новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса прадугледжана норма, якая дазволіць банкам высяляць з пабудаваных кватэр неплацельшчыкаў крэдытаў праз суд. Гэтае новаўвядзенне павінна паспрыяць больш актыўнаму выкарыстанню банкамі сістэмы іпатэчнага крэдытавання.

Новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса прапануе больш жорсткія меры адказнасці для неплацельшчыкаў камунальных паслуг, паведаміла **начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Наталля КАЧАН**. Гэта датычыцца і наймальнікаў, і ўладальнікаў жылля. Сёння, па дзеючым заканадаўстве неплацельшчыка-наймальніка магчыма выселіць у іншае жылое памяшканне меншых памераў тыпавых спажывецкіх якасцяў у межах таго ж населенага пункта. Новы праект Кодэкса дазволіць перасяляць нядбайных гаспадароў у менш якасныя жылыя памяшканні, нават у іншыя населеныя пункты. У дзяржаўным жыллёвым фондзе прадугледжваецца яшчэ адзін метад уздзеяння на неплацельшчыкаў — прымусовы абмен жылля з грамадзянамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Трохпакаёвая кватэра неплацельшчыка можа быць абмененая на аднапакаёвую кватэру «чаргавіка». У гэтым выпадку кампенсацыя за два страчаныя пакоі не прадугледжваецца.

Каля 87 працэнтаў жылля сёння знаходзіцца ва ўласнасці жыхароў. Выселіць такіх неплацельшчыкаў нават па судзе вельмі складана. Праект новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса дазваляе вырашаць праблемы і з такімі ўласнікамі жылля. Цяпер будзе давацца тэрмін на пагашэнне запазычанасці. Пасля гаспадар перасяляецца ў часовае жыллё, а яго памяшканне прадаецца на аўкцыёне. З атрыманых грошай гасіцца запазычанасць за камунальныя паслугі і набываецца больш таннае жыллё. Гэты механізм сёння здаецца даволі складаным, бо ў сем'ях з няпоўнагадовымі дзецьмі пытанне аб высяленні разглядаецца сумесна з органамі апекі.

## СЛУЖЫЦЕ АЙЧЫНЕ, ЯК ДЗЯДЫ СЛУЖЫЛІ!



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



**Учора ў беларускія войскі адправіліся першыя паўтары тысячы прызыўнікоў лета-2010. Адпраўка працягнецца да 30 ліпеня**

З бацькамі мінчаніна Максіма Гамезы карэспандэнт «Звязды» пазнаёмілася на тэрыторыі Мінскага гарадскога зборнага пункта, дзе праходзіла ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае пачатку адпраўкі ў войска новага папаўнення. Маці Алена і бацька Аляксандр ганарацца, што іх адзіны сын будзе служыць у войсках Міністэрства ўнутраных спраў. «Максім марыў там служыць, — кажа Алена Гамеза. — Хвалюемся, што ён сыходзіць на два гады з дому. Але за службу сына спакойныя, упэўнены, што ўсё будзе добра».

СТАР. 2



Ілюстрацыя з кнігі У. АРЛОВА і З. ГЕРАСІМОВІЧА «Краіна Беларусь».

Вялікі князь Вітаўт у бітве пад Грунвальдам. Фрагмент карціны Яна МАТЭЙКІ, 1878 год.

## ГРУНВАЛЬД — напамін, што мы — нацыя рыцараў і асілкаў!

СТАР. 2

## Пад Мінскам з'явіцца другі інтэрнат павышанай камфортнасці для ветэранаў вайны і працы

У вёсцы Траскоўшчына Мінскага раёна плануецца адчыніць другі інтэрнат павышанай камфортнасці для ветэранаў вайны і працы «Світанак». Пра гэта расказала начальнік аддзела сацыяльных установаў Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вікторыя Грачыха.

Інтэрнат размесціцца ў рэканструяваным будынку, у якім раней размяшчаўся аднайменны санаторый-прафілакторый «Світанак» ААТ «Белмедпрэпараты».

Для будучых насельнікаў тут прадугледжаныя пакоі на аднаго-двух чалавек з новай мэбляй. У блоку ёсць ванны пакой і душ, на кожным паверху — вялікая сталоўка. Інтэрнат разлічаны на 150 жыхароў, працаваць з якімі будуць 87 спецыялістаў абслуговага персаналу, у тым ліку 28 медыцынскіх работнікаў.

Іскрынка праекта — каскад з трох сажалак, якія цяпер знаходзяцца на стадыі добраўпарадкавання, а таксама працамайстэрні.

У сталіцы цяпер налічваецца восем стацыянарных установаў сацыяльнага абслугоўвання для пенсіянераў і інвалідаў. Згодна з пастановай Савета Міністраў Беларусі № 1408, калі пажылы чалавек не ў стане сябе абслугоўваць і ў яго няма працаздольных членаў сям'і, ён знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні. Калі ж ёсць (звычайна дзеці), то за яго пражыванне ў такой установе трэба плаціць — каля 650 тысяч рублёў у месяц.

**Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».**

БПС-БАНК

**В связи со снижением с 14 июля 2010 г. ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 11,5 % годовых, ОАО «БПС-Банк» устанавливает с 15 июля 2010 г. по вновь привлекаемым депозитам и сберегательным сертификатам физических лиц в белорусских рублях следующий размер процентных ставок:**

| Наименование | Срок привлечения | Размер процентов (годовых) | | |
|---|---|---|---|---|
| «Праздничный» | 65 дней | 16,5 | | |
| «Актуальный» | 6 месяцев | 18,5 | | |
| «Баланс интересов» | 1 год | за 1-й – 4-й месяцы | за 5-й – 10-й месяцы | за 11-й – 12-й месяцы |
| | | СР + 5 | СР + 6 | СР + 9 |
| «Перспективный» | 18 месяцев | СР+7,5 | | |
| Сберегательный сертификат | 6 месяцев | 18 | | |
| «К совершеннолетию» | 2 года | СР + 3 | | |
| | 3 года | СР + 4 | | |
| депозит и карт-счет «Пенсионный» | до востребования | СР | | |

По договорам срочных банковских депозитов **«Перспективный», «Баланс интересов», «К совершеннолетию», депозита и карт-счета «Пенсионный»,** заключенным до 15 июля 2010 г., устанавливаемые процентные ставки применяются с 16 августа 2010 года.

С 16 августа 2010 года по договорам срочного банковского депозита в иностранной валюте (доллары США, евро) «Динамичный», заключенным до 6 апреля 2009 на 3 года, устанавливается процентная ставка в размере 10 % годовых.

**Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:**

- **148** (в стационарной сети);
- МТС **(029) 5 148 148, 2 148 148**;
- Velcom **(044) 77 00 148, 77 55 148**.

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2009 г. (млрд. руб.): январь – 4,6; февраль – 4,0; март – 4,8; апрель – 4,8; май – 4,7; июнь – 5,0; июль – 4,9; август – 4,9; сентябрь – 4,9; октябрь – 5,1; ноябрь – 5,6; декабрь – 5,8.

Проценты, выплаченные по депозитам в иностранной валюте в течение 2009 г. (млрд. руб.): январь – 6,2; февраль – 6,2; март – 7,5; апрель – 7,0; май – 6,7; июнь – 7,6; июль – 7,5; август – 7,6; сентябрь – 7,5; октябрь – 7,5; ноябрь – 7,6; декабрь – 7,6.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.07.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША ... 2999,00 | 1 чэшская крона ... 150,15 |
| ▲ 1 еўра ... 3 815,93 | 1 польскі злоты ... 939,32 |
| 1 латвійскі лат ... 5 395,83 | ▲ 1 расійскі рубель ... 98,20 |
| 1 літоўскі літ ... 1 104,67 | 1 украінская грыўня ... 379,52 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,5390 |
| 10 UAH | 38,6472 |
| 1000 BYR | 10,1290 |
| EUR | 38,8090 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЯРАСЛАЎ КАЧЫНЬСКІ АБВІНАВАЦІЎ У СМЕРЦІ БРАТА ЎРАД ПОЛЬШЧЫ



**Брат былога прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага Яраслаў абвінаваціў урад краіны ва ўскосным дачыненні да авіякатастрофы пад Смаленскам.**

На яго думку, кіраўніцтва краіны не жадала ўхваліць куплю новага самалёта для Качыньскага, і яму даводзілася лётаць на Ту-154 1990 года выпуску.

### У АЗЕРБАЙДЖАНЕ З'ЯВІЦЦА СПІС ЗАБАРОНЕНЫХ ІМЁНАЎ

**У Азербайджане плануецца скласці спісы дазволеных і забароненых імёнаў. Пра гэта паведамляе ІА «Трэнд» са спасылкай на дырэктара Інстытута інфармацыйных тэхналогій азербайджанскай акадэміі навук Расіма Алігуліева.**

Зараз спецыяльная камісія акадэміі навук па просьбе міністэрства юстыцыі даследуе значэнне розных імёнаў. Па выніках працы камісіі будуць складзены спісы. Імёны мяркуецца падзяліць на тры катэгорыі. У «зялёны спіс» увойдуць імёны, якія, як мяркуюць акадэмікі, «адпавядаюць нацыянальным, культурным і ідэалагічным каштоўнасцям». Даваць іх сваім дзецям грамадзяне Азербайджана змогуць без якіх-небудзь абмежаванняў. У «жоўты спіс» будуць уключаны імёны, якія лічацца непажаданымі (напрыклад, таму, што яны брыдка гучаць на іншых мовах). Нарэшце, «чырвоны спіс» будзе ўтрымліваць забароненыя імёны — напрыклад, імёны, якія насілі «асобы, што здзейснілі агрэсію супраць азербайджанскага народа». Пачаць ужыванне гэтай схемы, як заявіў дырэктар інстытута, плануецца ўжо ў 2010 годзе.

### МЯДЗВЕДЗЕЎ ПРЫЗНАЎ СВАЮ БАРАЦЬБУ З КАРУПЦЫЯЙ БЯСПЛЁННАЙ

**Прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў, выступаючы ў сераду на пасяджэнні Савета заканадаўцаў, выказаў сваё незадавальненне вынікамі ініцыяванай ім барацьбы з карупцыяй у Расіі і прызнаў, што ніякіх значных поспехаў у гэтым кірунку дасягнута не было, паведамляе «Інтэрфакс».**

У ліку незадаволеных ходам барацьбы з карупцыяй Мядзведзеў назваў як расійскіх грамадзян, так чамусьці і саміх карупцыянераў. «Відавочна, што станам барацьбы з карупцыяй незадаволены ніхто — ні нашы грамадзяне, якія лічаць карупцыю адной з самых сур'ёзных праблем, адным з самых вялікіх выклікаў нашай дзяржаве, ні чыноўнікі, ні самі карупцыянеры», — заявіў прэзідэнт.

### ГАЗ ДЛЯ ЖЫХАРОЎ УКРАІНЫ ПАДАРАЖЭЕ НА 50 ПРАЦЭНТАЎ

**Рознічныя кошты на газ для насельніцтва Украіны з 1 жніўня 2010 года вырастуць на 50 працэнтаў. Пра гэта паведамляе УНІАН са спасылкай на пастанову Нацыянальнай камісіі рэгулявання электраэнергетыкі Украіны ад 13 ліпеня.**



Апошняе павышэнне адпускных коштаў на прыродны газ для насельніцтва Украіны было 1 снежня 2008 года. Тады кошт газу быў павялічаны на 35 працэнтаў.

Падвышэнне ўнутраных коштаў на газ з'яўлялася адной з умоў выдаткавання Украіне антыкрызіснага крэдыту Міжнароднага валютнага фонду. У сакавіку 2010 года першы віцэ-прэм'ер Украіны Андрэй Клюеў заяўляў, што ўрад Украіны не мае намеру павялічваць кошты на газ для насельніцтва. Ён адзначаў, што ўкраінскія ўлады вядуць перамовы з Расіяй, і, калі атрымаецца «прымальна адпрацаваць» кантракты, то ўнутраныя кошты на паліва павялічваць не прыйдзецца. У выніку Масква дала Кіеву зніжку на газ, але віцэ-прэм'ер Украіны Сяргей Цігіпка назваў павышэнне тарыфаў на газ і камунальныя паслугі для насельніцтва неабходнымі. У той жа час ва Украіне на патрэбы насельніцтва ідзе прыродны газ, які здабываецца на тэрыторыі Украіны.

## МІНТРАНС НА ТРАНЗІТ ГЛЯДЗІЦЬ АПТЫМІСТЫЧНА

**НА 24 % павялічыць даходы ад транзітных перавозак праз тэрыторыю краіны плануе Міністэрства транспарту і камунікацый на працягу бліжэйшых пяці гадоў. Пра гэта на прэс-канферэнцыі заявіў Павел БАЖАНАЎ, начальнік упраўлення стратэгічнага развіцця, каардынацыі і інвеставання транспартных сістэм Мінтранса.**

— У нас ёсць два варыянты развіцця — аптымістычны і песімістычны. Дык вось, па аптымістычным варыянце мы плануем, што за 5 гадоў зможам павялічыць даходы ад транзіту на 24 %. Песімістычны варыянт прадугледжвае павелічэнне даходаў на 10 %, але ён зроблены як пункт адліку, ніжэй за які мы не павінны апусціцца. А мэта — дасягнуць запланаваныя 24 %, і ўсе нашы намаганні будуць сканцэнтраваныя на гэтым максімальным варыянце, — адзначыў Павел Бажанаў.

Для дасягнення запланаванага выніку распрацаваны і накіраваны ва Урад праект Стратэгіі развіцця транспартнага патэнцыялу на 2011—2015 гады. У адпаведнасці з гэтым дакументам дасягненне пастаўленай мэты па павелічэнні даходаў ад транзіту будзе рэалізоўвацца праз вырашэнне чатырох задач: удасканаленне заканадаўства, рэканструкцыя і мадэрнізацыя транзітнай інфраструктуры, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне транзіту, пашырэнне камунікацыйных і фінансавых калідораў.

Павел Бажанаў адзначыў, што рэалізацыя стратэгіі створыць больш прывабныя ўмовы для ажыццяўлення транзіту праз Беларусь за кошт гарманізацыі нашага заканадаўства з аналагічным міжнародным, за кошт удасканалення транзітнай інфраструктуры, прымянення інавацыйных тэхналогій і забеспячэння высокай якасці аказання транзітных паслуг.

Прынамсі, Павел Уладзіміравіч больш падрабязна спыніўся на стварэнні транспартна-лагістычных цэнтраў. Па яго словах, сёння актыўна ідзе будаўніцтва транспартна-лагістычнага цэнтра «Прылессе» іранскай кампаніяй, яшчэ адзін цэнтр плануецца пабудаваць каля Нацыянальнага аэрапорта з удзелам бельгійскага інвестара. Таксама Павел Бажанаў расказаў і пра планы па стварэнні транспартна-лагістычнага цэнтра каля Аршанскага авіярамонтнага завода:

— Зараз вядуцца перамовы з латышска-аўстрыйскім інвестарам, але нядаўна з'явіўся і новы інвестар з Ган-Конгу. Ён прапануе ажыццяўляць транспарціроўку грузаў кітайскага паходжання, бо самалёты, якія лётаюць у Кітай, у Еўропу не пускаюць, таму яны лётаюць у Дамадзедава, якое на сёння вельмі загружанае. Таму плануецца частку грузапатокаў пераразмеркаваць пад Оршу. Авіярамонтны завод будзе працаваць і па-ранейшаму, проста ўзлётна-пасадачная паласа будзе больш загружаная і будуць выкарыстоўвацца зямельныя ўчасткі, не патрэбныя заводу. Праекты гэты вельмі вялікі, мы нават трохі з трывогай да такіх вялікіх планаў ставімся, але сёння ўжо дакументальна пацверджаныя фінансавыя магчымасці, таму, я мяркую, у бліжэйшы час мы ўсё гэта афармім у выглядзе інвестыцыйнага дагавору, — сказаў Павел Бажанаў.

СТАР. 2

## МАЛАДЫЯ КАНКУРСАНТЫ: 80 І БОЛЬШ





У аўторак уначы сталі вядомыя прозвішчы лідараў па выніках першага выступлення па набраных балах на міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў «базару». Прадстаўніца Казахстана стала лідарам — 86 балаў, прадстаўнік Харватыі атрымаў 84, Грузіі — 83. Наш зямляк Дзяніс Вяршэнка атрымаў толькі 78 балаў.

Старшыня журы — народная артыстка Украіны Таіса Павалій падчас размоў з рэпарцёрамі паабяцала судзіць сумленна. Дарэчы, яна — першая прадстаўніца ўладальнікаў «Гран-пры «базару», якой даверылі ўзначаліць журы. «Адказнасць на мне вялікая! — падкрэслівае артыстка. — Ацэнкі будуць ставіць члены журы. Вы іх убачыце. Як я паўплываю на вынікі?»

Яшчэ перад першым конкурсным днём старшыня журы адзначыла, што галоўнае для маладога артыста — выходзіць на сцэну так, быццам ты «зорка». І не трэба думаць, што твае канкурэнты праспявалі лепш за цябе. Ты — лепшы, і ўсё тут...

Упэўнены, не трэба ў чарговы раз у мажорных нотах зноў расказваць «казкі» пра тое, што менавіта на «базары» самы сумленны конкурс. Было рознае. І «прапіхвалі» «сваіх» канкурсантаў у лік пераможцаў члены журы. І не адзін раз...

Сёлета, бадай, захады журы як ніколі супалі з уражаннямі гледачоў.



Дынара СУЛТАНГАЛІЕВА.

Тая ж 23-гадовая Дынара Султангаліева з Казахстана. Такіх публіка любіць. Дарэчы, на сцэне яна выступае з пяці гадоў. Без прэтэнзій на «зорнасць». Вельмі прыгожая і сціплая дзяўчына ў стыльным адзенні (выйшла на сцэну Летняга амфітэатра ў белых штанах і жакеце). І так праспявала «Ты» на роднай казахскай мове, што проста мурашкі пабеглі па спінах многіх гледачоў. Голас вельмі моцны.

Прадстаўнік Харватыі Дамір Кеджо (яму 23 гады) сам сябе параўнаў з Мікі Маўсам (дарэчы, яшчэ адна ўдзельніца конкурсу выдала такое параўнанне і пра сябе).

Бадай, самы «каларытны» з лідараў — прадстаўнік Грузіі Лаша Рамішвілі. Яму 29 гадоў. Ён — прафесійны артыст. Высокі, моцны — мара многіх жанчын: прыгожы грузін, які добра спявае...

Таксама 83 балы атрымала прадстаўніца Арменіі Анаіт Шахбазян, 81 — прадстаўнік Босніі і Герцагавіны Вукашын Браіч, 80 — прыгажуня Іна Воранава з Украіны. З ёй, аказваецца, на «базар» прыехаў муж. Зразумела, я б таксама пабаяўся такую прыгажосць адпусціць адну на конкурс, дзе шмат прывабных мужчын. 80 балаў атрымаў і Ёцэ Панаў з Македоніі.

Наш зямляк Дзяніс цудоўна выканаў песню «Птушкі» на беларускай мове. Ды, відаць, «не прабіў» журы па нейкіх прычынах.

Будзем спадзявацца, што Дзяніс «сабярэцца» і ў другім туры выступіць лепш.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# СЛУЖЫЦЕ, ЯК ДЗЯДЫ СЛУЖЫЛІ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Усяго для праходжання тэрміновай службы гэтым летам плануецца накіраваць каля 10 тысяч маладых людзей, на службу ў рэзерве — каля 2 тысяч прызыўнікоў.

— На сённяшні раённыя і гарадскія прызыўныя камісіі ўжо прынялі больш за 40 тысяч рашэнняў у дачыненні да прызыўнікоў, — паведаміў **начальнік аддзела прызыву на ваенную службу галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генштаба Узброеных сілаў палкоўнік Андрэй МУРАШОЎ**. — У тым ліку дазволілі 22 тысячы адтэрміновак, каля 80 працэнтаў з якіх звязаныя з працягам адукацыі.

Таксама права на адтэрміноўку атрымалі дзеці-сіроты; дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў; грамадзяне, якія знаходзяцца ў складаным сямейным становішчы альбо якія не прайшлі па стане здароўя. Да слова, узровень захворвання прызыўнікоў па-ранейшаму застаецца высокім.

**Ухілісты складаюць менш за 1% ад усіх прызыўнікоў.**

— Дастаткова шмат прызыўнікоў маюць на сённяшні захворванні, якія перашкаджаюць праходжанню тэрміновай ваеннай службы. Самыя частыя — захворванні сэрца і касцёва-мышачнай сістэмы.

Што тычыцца ўхілістаў, то па выніках работы прызыўных камісій, як адзначыў Андрэй Мурашоў, яны на сёння складаюць менш за 1 працэнт ад усіх прызыўнікоў.

— Гэта не праблема Узброеных сілаў альбо непасрэдна прызыўных камісій. Гэта праблема самога грамадзяніна, які ў адпаведнасці з заканадаўствам за ўхіленне ад свайго канстытуцыйнага абавязку нясе пэўную адказнасць, адміністрацыйную альбо крымінальную. Падобная практыка ёсць ва ўсіх цывілізаваных дзяржавах.

Акрамя салдатаў тэрміновай службы, у беларускіх войсках служаць кантрактнікі (каля 40 працэнтаў ад усіх ваеннаслужачых). Але пакуль што ў Беларусі не лічаць мэтазгодным цалкам пераводзіць армію на прафесійную аснову. Хоць, як адзначыў Андрэй Мурашоў, гэты варыянт з'яўляецца дастаткова прывабным.

— Тэрміновая служба добрая ў першую чаргу тым, што дазваляе падрыхтаваць ваеннаабучаны рэзерв, які, у выпадку неабходнасці, можна мабілізаваць на абарону дзяржавы.

Таксама Андрэй Мурашоў упэўнены ў тым, што ў бліжэйшы час міжведамасная група выпрацуе найбольш аптымальны механізм для праходжання альтэрнатыўнай службы. Пры яго распрацоўцы будзе ўлічаны вопыт іншых краін, у тым ліку расійская практыка.

**Цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі ў злучэннях і воінскіх часцях Узброеных сілаў пройдзе 14 жніўня.**

**Надзея ДРЫЛА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎПЭЎНЕНЫ Ў ДАЛЕЙШЫМ ПАШЫРЭННІ БЕЛАРУСКА-ФРАНЦУЗСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі з нацыянальным святам — Днём узяцця Бастыліі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ўзаемныя крокі насустрач і пашырэнне беларуска-французскага супрацоўніцтва па розных напрамках будуць і ў далейшым садзейнічаць умацаванню дружалюбных адносінаў паміж дзвюма краінамі, міру і стабільнасці на еўрапейскім кантыненце.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў надзею на далейшае пазітыўную дынаміку двухбаковых кантактаў Беларусі і Францыі.

# Мінтранс на транзіт глядзіць аптымістычна

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі ж казаць не толькі пра транспартную лагістыку, а пра транзіт у цэлым, то Павел Бажанаў нагадаў, што сёлета ідзе апошні год рэалізацыі Комплекснай праграмы забеспячэння эфектыўнага выкарыстання транзітных магчымасцей Рэспублікі Беларусь на 2006—2010 гады:

— Максімальныя значэнні праграмы былі дасягнутыя ў дакрызісным 2008 годзе — тады мы ад транзіту атрымалі даход больш за 2,6 мільярда долараў, і рост гэтага паказчыка склаў 67 % ад узроўню 2006 года, калі пачынала дзейнічаць праграма. Калі б не крызіс, то, я мяркую, паказчыкі і далей бы прырасталі, аднак крызіс паўплываў на попыт тавараў і паслуг і, як вынік, знізіліся аб'ёмы транзіту і даходы ад ажыццяўлення гэтай дзейнасці.

Прынамсі, у 2009 годзе даходы ад транзіту прыроднага газу знізіліся на 83 мільёны долараў у параўнанні з дакрызісным 2008 годам, ад транзіту паветраных судоў — на 8 мільёнаў долараў, пасажыраў і грузаў на чыгунцы — на 14 і 58 мільёнаў долараў адпаведна, рэзідэнты Рэспублікі Беларусь ад транзітных перавозак аўтамабільным транспартам атрымалі даходаў менеей на 358,4 мільёна долараў. Затое былі павялічаны даходы ад транзіту нафты — на 12 мільёнаў долараў. Такім чынам, усяго даходаў ад транзіту краіна ў 2009 годзе атрымала меней на 605,7 мільёна долараў у параўнанні з 2008 годам, але пры гэтым планавае заданне на 2009 год было выканана і нават перавыканана амаль на 40 мільёнаў долараў — усяго за мінулы год даходы ад транзіту перасягнулі мяжу ў 2 мільярды долараў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ГРУНВАЛЬД — напамін, што мы — нацыя рыцараў і асілкаў!

*альбо 10 фактаў пра Грунвальскую бітву, пра якія вам было сорамна пытацца*

**У кого з нас ні спытай, ці ведаем Грунвальдскую бітву — кожны адкажа: «Вядома! Як жа яе не ведаць?!» І праўда — сорамна беларусам не ведаць пра Грунвальд! Аднак калі пачынаеш разбірацца, дык не кожны згадае, хто там біўся, з кім, дзе і навошта. Сёння, у дзень 600-годдзя вялікай перамогі пад Грунвальдам (15 ліпеня 1410 года) «Звязда», пры дапамозе прафесара, доктара гістарычных навук Анатоля ГРЫЦКЕВІЧА коратка нагадвае асноўныя моманты. Выразай і захоўвай!**

### 1. Хто з кім біўся?

Білася беларуска-літоўскае войска разам з саюзным польскім войскам супраць нямецкага Тэўтонскага рыцарска-манаскага ордэна. Але «манаскага» не ў традыцыйным значэнні, а дзе манахі павінны былі не маліцца, а ваяваць, каб распаўсюджваць веру Хрыстову сярод язычнікаў (паганцаў). У Тэўтонскім ордэне былі не толькі немцы — туды прыязджалі для практыкі рыцары з усіх краін Еўропы: былі і англійскія, і бургундскія, і французскія, нават з Пірынейскага паўвострава. З нашага боку — беларусы, палякі, летувісы, балты, чэхі на чале з Янам Жыжкам, невялікая група татараў. Захаваліся дакладныя звесткі, што большасць войска складалася з беларускіх харугваў — мсціслаўскай, аршанскай, берасцейскай, ваўкавыскай, віленскай, віцебскай, гарадзенскай, драгічынскай, лідскай, пінскай, навагрудскай, полацкай, слонімскай, смаленскай... Трыццаць з іх мелі на сваіх баявых сцягах герб «Пагоня».



Рэканструкцыя Грунвальдскай бітвы — улюбёны занятак сяброў сучаных рыцарскіх клубаў.

### 2. Дзе і калі?

Бітва адбылася 15 ліпеня 1410 года паміж прускімі мястэчкамі Грунвальд і Танэнбэрг. Паводле гісторыкаў, напярэдадні бітвы адбылося грандыёзнае паляванне ў Белавежскай пушчы, на якім нашыя продкі назапасілі харчу для сілкавання рыцараў — насалілі шма-а-а-ат мяса!

Цяпер месца бітвы — тэрыторыя Польшчы, блізкая да Калінінградскай вобласці. На тым месцы стаіць помнік, штогод адбываюцца святкаванні. На цяперашняе святкаванне 600-годдзя выправіліся і колькі беларускіх рыцарскіх клубаў.

### 3. Чаму менавіта там?

Месца бітвы было абумоўлена загадзя. Як і заўжды ў той час, месца выбіралася і ўзгаднялася абодвума бакамі, бо для такой маштабнай бойкі не любое поле падыдзе — трэба ж, каб было дзе развярнуцца. Грунвальдскае поле задаволіла абодва бакі. Нашаму боку гэта было звышвыгадна. Бо разбіць ворага на яго тэрыторыі было лепей і круцей. А заадно і каб на сваёй зямлі не было знішчэнняў, якія заўсёды ўчынялі крыжакі. Мы пайшлі насустрач, каб не пусціць іх сюды.

### 4. Хто на каго напаў?

Гэтая бітва сталася апагеем ваяўнічых паходаў Тэўтонскага ордэна на нашыя землі, якія пачаліся яшчэ ў XIII стагоддзі, калі скончыліся ў асноўным крыжовыя паходы ў Святую зямлю. Ваяўнічыя тэўтонцы зноў і зноў праводзілі свае захопніцкія рэйды — да васьмі разоў на год! Пяць разоў крыжакі рабілі спробу захапіць Полацак, чатыры разы — Навагрудак. Таму Грунвальдская бітва вырашыла лёс: ці будзе далей Тэўтонскі ордэн працягваць сваю агрэсію, захопліваць новыя землі і анямечваць людзей, як анямечылі прусаў і часткова яцвягаў.

### 5. За што біліся?

Фармальна паходы адбываліся пад рэлігійнай шыльдай — каб навяртаць мясцовае паганскае насельніцтва ў веру Хрыстовую. Аднак рэальнай мэтай быў, вядома, захоп земляў.

### 6. Няўжо Папа Рымскі ўхваляў крывавыя паходы?

Паходамі кіраваў сам Тэўтонскі ордэн. Фармальна ён падпарадкоўваўся імператару Свяшчэннай Рымскай імперыі. Але дзейнічаў амаль самастойна. Апасродкавана ордэн падпарадкоўваўся і Папу Рымскаму. То бок, фармальна Папа нібыта згаджаўся з паходамі, але выглядае, што ў яго не асабліва пыталіся.

### 7. Колькі было ваяроў з абодвух бакоў?

Гісторыкі так і не прыйшлі да адзінай думкі. Паводле самага распаўсюджанага меркавання, у Грунвальдскай бітве ўдзельнічала 25—40 тысяч ваяроў з нашага боку, крышачку менш — з нямецкага. Аднак у немцаў быў лепшы парадак, яны былі больш падрыхтаваныя да баёў. Яны ўвесь час змагаліся, былі больш спрактыкаваныя. А ў нас змагаліся, калі пачыналася вайна. Таму, улічваючы іх падрыхтоўку, можна сказаць, што сілы былі роўныя. І таму падчас самой бітвы было ваганне, невядома было, хто пераможа. Лёс бітвы вырашыўся літаральна ў канцы...

### 8. Ці працавала ў той час ваенная выведка?

Выведка працавала добра. Тады ўпершыню абодва бакі зрабілі планы паходаў — з вымярэннем адлегласці, нанясеннем пунктаў... Планы трымалі ў таямніцы. Калі ў Бярэсці Ягайла з Вітаўтам сабраліся яшчэ за год да бітвы, то была выстаўленая такая ахова, што ніхто не ведаў, пра што яны гавораць! І немцы даведаліся пра паход, калі ўжо вялікае войска пайшло туды!

### 9. Як развіваліся падзеі 15 ліпеня 1410 года?

Раніца для абодвух бакоў пачалася з малітвы — без гэтага ніводная бітва не магла адбыцца. Войскі пастроіліся — і адны, і другія. Ягайла ўвесь час маліўся — паўсюль пра гэта пішацца. Ён вельмі сумняваўся ў тым, што пераможа. Думаў, што калі больш памоліцца — дык пераможа. Скончылася тым, што Вялікі Магістр ордэна прыслаў Ягайлу два мячы, каб ён урэшце пачаў бітву, бо колькі чакаць?! А Вітаўт ірваўся ў бой. Тым больш што нашы ваяры ўжо не маглі чакаць, бо ўявіце — на ліпеньскай спякоце сядзець ва ўсім гэтым жалезе!..

Фармальна з нашага боку быў галоўны Ягайла, але фактычна камандаваў Вітаўт, бо Ягайла ўвесь час маліўся. Толькі пасля, калі ўжо кіпеў бой, Ягайла стаў актыўна кіраваць ягонай хадой, нават паслаў у гушчар сваю прыдворную харугву... Усім вядомы такі эпізод. На правым флангу былі воіны Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага як яно тады называлася. У пэўны момант лёгкая конніца «не вытрымала» націску нямецкіх рыцараў — і пачала адступаць. Рыцарам падалося, што яны перамагаюць. Пачаўся крык: «Літва ўцякае!» Яны натхніліся — і за імі паімчаліся іншыя, каб біць «уцекачоў». Гэта звычайная тактыка беларусаў!.. Тое самае рабіў пасля і Канстанцін Астрожскі. Уцякалі-ўцякалі, строй ворагаў перамяшаўся, ніякага парадку ўжо не было, і тады наша конніца развярнулася — і давай секчы тых тэўтонцаў...

Але першым усё-такі пачало наступаць войска Вітаўта. Немцы знарок не ішлі наперад, яны ж выкапалі «воўчыя ямы»: зверху прысыпаныя галлём, а ў іх завостраныя калы... І некаторая частка нашай конніцы трапіла туды і загінула... Але пасля нейкім чынам змаглі зламаць першы наступ, разбілі нямецкую пяхоту і пачалі ціснуць на варожую конніцу. Вось тады пачалася самая бітва... А другая палова дня 15 ліпеня — гэта калі немцаў абкружылі і пачалі знішчаць «па поўнай праграме». У палон спачатку не бралі, у палон бралі ўжо ў самым канцы — тых, хто ўцякаў, каб пасля атрымаць выкуп. На карціне Матэйкі адлюстравана, як загінуў сам Вялікі Магістр — яго працялі рагацінай з жалезнымі канцамі. Выжыць пры гэтым было немагчыма... Фактычна тады выратавалася і ўцякла толькі адна нямецкая харугва — і беглі тэўтоны ажно да Мальбарка (Марыенбурга), дзе схаваліся. Іх, вядома, маглі дагнаць і перахапіць. Але ж немцы кінулі абоз з багаццем — і нашы спыніліся, каб захапіць гэты абоз, а заадно — знішчыць 5000 чалавек чэлядзі, якая таксама была ўзброеная.

Бітва працягвалася каля 5-6 гадзін. Былі пэўныя перапынкі для пастраення войскаў.

Нашым рыцарам дапамагла расцярушанасць тэўтонскіх харугваў, якая адбылася дзякуючы нашай хітрасці. Дапамагло вельмі кваліфікаванае ўступленне ў бой нашых харугваў — па чарзе, каб не было балагану. Гэтая тактыка была незнаёмая для рыцараў... Дарэчы, пасля бітвы нашы войскі яшчэ стаялі там пару дзён — хавалі забітых: і нашых, і іхніх.

### 10. Значэнне Грунвальдскай бітвы для Беларусі

Для нас гэтая бітва важная ў некалькіх момантах. Па-першае, гэта перамога над вельмі сур'ёзнай арміяй, якая ўвесь час наносіла ўдары. Дзякуючы перамозе пад Грунвальдам спыніліся набегі крыжакоў: на беларускую тэрыторыю яны ўжо не прыходзілі. Спынілася пагроза знішчэння дзяржавы, падпарадкавання нашых народаў ордэну і анямечвання. У эканамічным сэнсе быў вызвалены шлях да Балтыйскага мора праз Нёман і праз Заходнюю Дзвіну. Пасля гэтага мы пачалі вольна гандляваць з краінамі Балтыйскага мора. Гэта справакавала аграрную рэформу, пасля якой вялікая колькасць збожжа і лесу ішла на продаж у краіны Скандынавіі і Паўночнай Германіі. Быў перыяд, калі Беларусь была настолькі заможная, што карміла сваім хлебам усю Паўночную Еўропу. Да ўсяго ж, Грунвальдская бітва — паказчык, што беларускі народ ужо ў тыя часы змагаўся за сваю незалежнасць, за сваю дзяржаву. Гэта — сведчанне вялікага вайсковага майстэрства беларусаў. Напамін, што мы — нацыя рыцараў і асілкаў!

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

## ТЫМ ЧАСАМ

**Вуліца Грунвальдская: у Лідзе будзе, у Полацку — невядома**

Як мы паведамілі яшчэ ў красавіку, у Полацку ідзе абмеркаванне, ці патрэбная ў горадзе вуліца Грунвальдская. Прапаноўваецца перайменаваць вуліцу Войкава, які непасрэдна ўдзельнічаў у растрэле царскай сям'і. Полацкі выканкам у такіх пытаннях заўжды раіцца з гараджанамі. Так і цяпер: зладзілі апытанку на сайце, пайшлі ў народ. На сайце вынікі такія: 75,7 % наведнікаў — за Грунвальдскую! Але справа чамусьці замарудзілася. Як нам адказалі ўчора ў Полацкім гарвыканкаме, намеснік старшыні Мікалай Ільюшонак — у адпачынку. А менавіта ён і заёмаецца пытаннем. Таму пакуль нічога невядома. Няўжо не хапіла чатырох месяцаў, каб да слаўнага юбілею паспець?..

А вось у Лідзе пэўнасць ужо ёсць. У аддзеле ідэалогіі нам паведамілі, што адпаведнае рашэнне — перайменаваць частку вуліцы Энгельса, якая ідзе блізу замка, у вуліцу Грунвальдскую было прынятае яшчэ ў чэрвені. Але ў сілу яно ўступае толькі 1 жніўня, тады і шыльдачкі на дамах пачнуць замяняць. Хоць да круглай даты не паспелі, але і так добра.

Рэзананс

# ДАМЫ Ў НАС — РОЗНЫЯ. А ВОСЬ КЛОПАТ АДЗІН — АГУЛЬНЫ...

**У газеце «Звязда» за 2 сакавіка быў змешчаны ліст «Кветнікаў няма і не будзе...». Напісалі яго жыхары дома № 81, што па сталічнай вуліцы Рафіева. З тым жа поспехам маглі б мы (вуліца Казінца, 45) ды і многія, многія іншыя, чые вокны выходзяць на прадуктовыя крамы, бо да іх, гэтых крамаў, па-першае, штодзённа пад'язджае безліч машын, якія «прасуюць» двары, знішчаючы зялёныя пасадкі, ствараюць небяспеку і г.д. А па-другое, ля іх (выпіўка ж таксама прадукт!) з ранку да вечара «тусуецца» пэўны кантынгент людзей з усімі адсюль наступствамі.**

Не жадаючы з ім (і з імі!..) мірыцца, я таксама звяртаўся ў розныя інстанцыі, але асаблівага плёну гэта не дало. Прынамсі, год таму рашэннем Мінскага гарвыканкама быў павялічаны тэрмін працы прадуктовых крамаў: у выніку тая, што пад нашымі вокнамі (№ 24) стала адчыняцца ў 8.00 і зачыняцца ў 23.00. Няхай, здавалася б, але...

Чакаючы адкрыцця патрэбнага аддзела, ля дома з самага ранку збіраюцца кампаніі, мякка кажучы, выпівох. І балююць потым да позняга вечара — пад вокнамі, ля пад'ездаў, на дзіцячых пляцоўках...

Калі я пра гэта завёў размову з адміністрацыяй крамы, мне адказалі, што ўсё разумеюць, але ж ёсць рашэнне гарвыканкама, і яны павінны яго выконваць.

Тады я падаў пісьмовую заяву ў гарвыканкам, зрабіў акцэнт на тым, як «карысна» дзецям пастаянна сутыкацца з праявамі алкагалізму, прывыкаць да іх, прымаць за норму жыцця...

І вось атрымліваю адказ. Праўда, не з Мінскага гарвыканкама, а з адміністрацыі свайго Кастрычніцкага раёна, што мяне, уласна кажучы, шчыра здзівіла, бо гэта пытанне зусім не яе (не адміністрацыі раёна...). Што пацвердзіў і змест, дзе даецца спасылка на пратакол пасяджэння Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26.05.2009 № 2 і даручэнне Міністэрства гандлю краіны аб мерах па ўдасканаленні рэжыму працы рознічнай гандлёвай сеткі, зыходзячы з чаго і быў зменены рэжым працы крамы № 24...

Апошнія радкі ў тым лісце-адказе, праўда, давалі нейкую надзею на тое, што ўзнятае мной пытанне можа вырашыцца станоўча. Цытую на мове арыгінала: «В настоящее время подготовлен проект решения Минского городского Совета народных депутатов об ограничении реализации спиртных напитков в торговой сети города. После согласования данного документа в Министерстве юстиции Республики Беларусь все магазины города будут осуществлять торговлю алкогольными напитками и пивом с 9.00 до 22.00».

Думаў, што яно добра было б «пачутае ўбачыць»!..

Яно ж, як быццам, толькі на гадзіну пазней крама адчыніцца і на гадзіну раней зачыніцца, але тады раніцай нашы дзеці спакойна, не сустракаючы на сваім шляху (ля крамаў) абрыдлых кампаній, пайшлі б у школы, а па вечарах спакойна засыналі б, не пытаючыся ў бацькоў, што за крыкі за вокнамі...

Усцешвала яшчэ і тое, што ў нашай краіне многія адказныя асобы разумеюць, што нясе алкаголь. Напрыклад, першы намеснік міністра ўнутраных спраў у сваім інтэрв'ю напярэдадні Дня беларускай міліцыі адзначыў, што ён катэгарычна супраць таго, каб наогул распівалася любое спіртное. «У першую чаргу таму, што на вуліцах знаходзяцца нашы дзеці, якія ўсмоктваюць усё, што чуюць і бачаць вакол, як губка. Нельга дапусціць, каб будучае пакаленне лічыла распіванне алкагольных напояў на прыпынку ці ў гарадскім транспарце нормай. Гэта таксама элемент выхавання... Алкаголь — гэта зло».

Апошнюю думку намеснік міністра ўнутраных спраў пацвердзіў невясёлай статыстыкай: «Ад атручэння алкаголем у нашай краіне штогод памірае каля дзвюх з паловай тысяч грамадзян. Больш за 40 працэнтаў усіх злачынстваў учыняецца нападпітку. А такіх, як забойствы, згвалтаванні і нанясенні цялесных пашкоджанняў дык наогул больш за 80 %».

Заклапочана і Міністэрства аховы здароўя, бо ўжыванне алкаголю за апошнія 10 гадоў падвоілася і на карысць здароўю нацыі гэта, зразумела ж, не пайшло.

Карацей, я спадзяваўся, што і за Міністэрствам юстыцыі затрымкі быць не павінна, бо каму ж, як не яму, дбаць пра абарону правоў грамадзян.

Аднак яно, паводле паведамленняў прэсы, заклапочана не толькі абаронай правоў насельніцтва ды дзяцей, але і... гандляроў віна-гарэлачнай прадукцыяй, іх прыбыткамі. Зноў жа з усімі адсюль наступствамі.

У сувязі з гэтым хачу параіць тым, хто не падтрымаў праект Мінгарвыканкама па абмежаванні гандлю алкагольнай прадукцыяй, яшчэ раз перачытаць біблейскую гісторыю пра трыццаць Іудавых срэбранікаў. А яшчэ — прапанаваць хоць на нейкі час пераехаць у кватэры першых паверхаў дамоў № 81 па вуліцы Рафіева, № 45 па вуліцы Казінца і да іх падобных... Магчыма тады, атрымаўшы «асалоду» ад заўсёдных мацюкоў пад вокнамі і ад таго, што пад'езд і кожны кут дома выкарыстоўваецца як прыбіральня, яны зменяць сваё рашэнне.

На карысць гэтага, трэба дадаць, як блізкі, так і далёкі досвед. У Расіі, напрыклад, Дзярждума разглядае праект закона аб абмежаванні продажу спіртнога ад 10 гадзін раніцы да 21 гадзіны ўвечары. У Канадзе, наколькі ведаю, многіх з нашых суайчыннікаў здзівіла, што крамы, якія гандлююць спіртным, знаходзяцца ў малапрыкметных месцах, побач з якімі ніколі не бывае дзяцей, і паход у такую краму грамадствам ніколі не вітаецца, не ўхваляецца. У нас жа...

Павелічэнне працягласці гандлю спіртным, паўтаруся, адбылося год таму. Можна рабіць высновы. На розных узроўнях. Што датычыцца жыхароў нашага і падобных дамоў, нерваў мы спалілі шмат. Што ж выйграў гандаль? Як сказалі мне прадаўцы, прынамсі, нашай крамы, грашовай выручкі гэтае новаўвядзенне не прыбавіла, бо кантынгент пакупнікоў у віна-гарэлачных аддзелах адносна ўстойлівы, фінансавыя магчымасці — вельмі абмежаваныя...

Але сітуацыя можа змяніцца, калі значна папоўніцца кантынгент, калі ў яго «ўвальецца» моладзь.

Нам гэта трэба? Не!

Таму жыхарам дома № 81, што па вуліцы Рафіева, № 45, што па Казінца і многіх-многіх іншых хочацца параіць удумацца ў загаловак таго ліста ў газеце: «Кветнікаў няма і не будзе».

Не будзе і сапраўды, калі мы не навучымся адстойваць свае правы, не прымусім паважаць сябе і сваю працу, не праявім упартасць і ўзаемадапамогу.

**А.В. СЫРАМАЛОТ.**

*г. Мінск.*

# Усе рыцары едуць у Мсціслаў!

**У Мсціславе рыхтуюцца да «Рыцарскага фэсту-2010». Свята сярэднявечнай культуры адбудзецца 24-25 ліпеня.**

Старажытны Мсціслаў будзе прымаць рыцараў і іх прыгожых дам трэці год запар. У фэсце возьмуць удзел больш за два дзясяткі рыцарскіх клубаў. Акунуцца ва ўмоўны, але гераічны і незабыўны свет сярэднявечнай культуры запрашаюцца ўсе!

**Праграма «Рыцарскага фэсту-2010» разнастайная.** Ён пачнецца раніцай ў праваслаўным храме Аляксандра Неўскага і каталіцкім Кармеліцкім касцёле малебнамі ў гонар воінаў-мсціслаўцаў, якія загінулі за Айчыну на полі бітвы. Потым — святочнае тэатралізаванае шэсце, якое ачоліць на кані сам кароль Ягайла! Традыцыйна адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная гісторыі Мсціслава. Аматары роднай гісторыі могуць наведаць у часе фэсту знакамітыя на ўсю Беларусь славутасці Мсціслаўшчыны. Напрыклад, усяго за 3 тысячы рублёў можна трапіць на экскурсію па калегіуме іезуіцкага манастыра, дзе будзе разгорнутая музейная выстава. А побач будзе працаваць «Мсціслаўскі скляпок», дзе можна асвяжыцца — прадэгуставаць вінныя і безалкагольныя напоі.

Для ўдзельнікаў і гасцей «Рыцарскага фэсту» будзе гатаваць сярэднявечная кухня. У гарадскім парку запрацуе Горад майстроў. На свяце выступяць «Песняры», розныя беларускія гурты, вогненны цырк. Будзе лазернае шоу і феерверк. Сярэднявечная дыскатэка позним суботнім вечарам запрашае моладзь, а білет на яе каштуе 1200 рублёў.

На Замкавай гары будуць праходзіць рыцарскія турніры. Уваход на іх платны: праўда, білеты каштуюць зусім нядорага. Каб трапіць на турніры мечнікаў і лучнікаў, трэба заплаціць 1100 рублёў, а кабназіраць за рознымі бугуртамі — 1500 рублёў.

Пра начлег і харчаванне гасцям «Рыцарскага фэсту» раяць паклапаціцца загадзя. Жыць можна нават у спальных карпусах старажытнага іезуіцкага манастыра, на тэрыторыі якога будзе працаваць і міні-кафэ. Дадатковую інфармацыю атрымайце ў аддзеле культуры Мсціслаўскага райвыканкама (02240)20967.

**Ілона ІВАНОВА.**

КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»
17 августа 2010 года
ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ
ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ
ОАО «ПТИЦЕФАБРИКА МЕДНОВСКАЯ»:
**лот № 1:** капитальные строения с инв. № 100/С-48666 (молочный блок) пл. 273,7 кв.м, с инв. № 100/С-48668 (коровник) пл. 1305,4 кв.м, с инв. № 100/С-48669 (коровник) пл. 1457,0 кв.м, расположенных по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, 0,5 км западнее д. Збунин, на земельном участке с кадастровым № 121200000001000762 площадью 1,8399 га, **с начальной ценой продажи: 56 700 000.**
Полная информация об аукционных торгах
по тел.: (0162) 23 81 92, (0162) 23 43 48.
Сайт: bgcn.by, city.brest.by

## Абзац

◢ **Да канца гэтага тыдня чакаецца ўзмацненне гарачыні. На тэрыторыю Беларусі перамяшчаецца яшчэ больш гарачае паветра з Сярэдняга Паволжа. Верагоднасць дажджоў паменшыцца. У суботу і нядзелю слупкі тэрмометра могуць дасягнуць адзнакі 35-36 градусаў, асабліва ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях.**

◢ Сярэдняя зарплата працуючага мінчаніна складае ў эквіваленце $500, паведаміў учора на прэс-канферэнцыі намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр Барысенка. «У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы мы ўжо выйшлі ў Мінску на паказчык $500 сярэдняй заработнай платы на аднаго працуючага. Да канца года мы плануем гэты паказчык перасягнуць», — адзначыў ён.

◢ **Зараз у Беларусі ў папраўчых калоніях усіх тыпаў, а таксама на выпраўленчых працах адбываюць пакаранне 47 тыс. чалавек.**

◢ Тры жыхары Крычава захоўвалі ў лесапасадцы 1,1 кг нявысушанай марыхуаны. Схованку выявілі супрацоўнікі міліцыі падчас аператыўных мерапрыемстваў. Усе тры 18-гадовыя хлопцы затрыманыя, заведзена крымінальная справа.

## Поўны абзац

◢ **Жыхара Новай Зеландыі шпіталізавалі з агністрэльным раненнем левай ягадзіцы, якое ён атрымаў па віне свайго сабакі. 40-гадовы мужчына з прыяцелямі і сабакам быў на паляванні. У момант здарэння стрэльба ляжала на заднім сядзенні машыны, а на пярэднім сядзеў гаспадар сабакі. Калі жывёлка заскочыла на задняе сядзенне, яна выпадкова націснула на курок, і куля спачатку прайшла праз пярэдняе сядзенне, а затым трапіла новазеландцу ў ягадзіцу. Пацярпелага даставілі ў бальніцу і правялі аперацыю. Яго стан стабільны.**

◢ Два пацыенты маскоўскай бальніцы, у якіх былі зламаныя рукі, не змаглі падзяліць, хто з іх першым пойдзе на працэдуры. Спрэчка перарасла ў бойку. Адзін штурхануў другога, той не ўтрымаўся і ўпаў, зламаўшы дадаткова і нагу. Урачы, што прыбеглі на вэрхал, вызначылі ў пацярпелага закрыты перэлом касцей правай галёнкі са зрушэннем, а таксама іншыя траўмы. Заведзена крымінальная справа.



◢ **У Зімбабвэ адчынілі пральню для амерыканскіх долараў. Калі ў ЗША купюра знаходзіцца ў хаджэнні 20 месяцаў, пасля чаго яе выключаюць з абароту, то зімбабвійцы не могуць дазволіць сабе такую раскошу. У самых буйных гарадах краіны з'явіліся спецыяльныя пральні, дзе з дапамогай спецыяльных мыйных раствораў вяртаюць банкнотам больш-менш прыстойны выгляд. Па жаданні кліента купюры могуць і папрасаваць. Паслуга карыстаецца вялікай папулярнасцю ў краіне, таму што за чысты долар можна купіць нашмат больш тавараў, чым за брудны. Цэнтральны банк Зімбабвэ дазволіў выкарыстоўваць амерыканскую валюту на ўнутраным рынку ў сувязі з гіперінфляцыяй мясцовага долара: летась інфляцыя ў краіне дасягнула 230 млн адсоткаў гадавых.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Асабістае

# НАШ ГРУНВАЛЬД

**15 ліпеня 1410 года сумеснымі намаганнямі войска Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства нанесла пад Грунвальдам знішчальнае паражэнне Тэўтонскаму Ордэну. Сёння знамянальная дата — 600-годдзе Перамогі пад Грунвальдам.**

Грунвальд пралягае праз нашы сэрцы і душы. Мы не можам назваць пайменна тых, хто загінуў пад Грунвальдам 15 ліпеня, але мы ведаем, што палеглі на тым полі нашы прадзеды з многіх беларускіх гарадоў. Хіба не былі там жыхары Пінска, Драгічына, Бярэсця, Ваўкавыска, Гародні?..





Але мы не былі ашчаднымі да сваёй гісторыі і часта звязвалі сваю будучыню з Захадам ці Усходам. Не жылі сваім жыццём, а спадзяваліся на суседзяў і падладжваліся пад іх. Нас выхоўвалі на полі Куліковым.

І не дзіўна, што сёння многія не ведаюць пра зніклую ў напластаваннях стагоддзяў Перамогу пад Грунвальдам. Але калі чалавек пытаецца: «А што пад тым Грунвальдам было?», то яшчэ не ўсё згублена.

Хацелася б, каб гэтая знамянальная дата адзначалася больш шырока, каб успомнілі пра яе не толькі ў Мінску, Навагрудку і Полацку, а ў кожным райцэнтры, каб у гонар 600-годдзя Грунвальдскай бітвы былі названыя вуліцы, каб гэтая падзея была ўвекавечана ў шматлікіх помніках ды памятных знаках.

Сёння ж, калі Беларусь стала суверэннай дзяржавай, абысці Перамогу пад Грунвальдам немагчыма.

Беларускае тэлебачанне з панядзелка (12 ліпеня) паказвае фільм пра гераічную падзею і даводзіцца шкадаваць, што цыкл тэлефільмаў: «Кроў». «Ордэн», «Вайна», «Поле» можна ўбачыць толькі ўдзень — калі людзі працуюць, а летам увогуле мала хто сядзіць у хаце. Але тым не меней — гэта ўсё ж крок наперад.

Грунвальд у перакладзе з нямецкага — гэта Зялёны лес, а калісьці ў беларускіх хроніках яго называлі Дуброўнай. Пад Баранавічамі, побач з аўтамагістраллю Брэст — Мінск, знаходзіцца вёска Дуброўна. Неяк падумалася, што тут можна было б паставіць памятны знак, але ж усё (ці амаль усё) залежыць ад мясцовай улады.

Дарэчы, з многімі кіраўнікамі раёнаў даводзілася ўздымаць тэму Грунвальда, паказваць







артыкулы ў нашай газеце, і ніхто не быў супраць ідэі адкрыцця адпаведнага знака, але ўсё заканчвалася размовай, шкадаваннем на недахоп грошай, гаспадарчымі турботамі, маўляў, жніво на падыходзе...

Жыццё неабходна ўспрымаць такім, якое яно ёсць. Хіба не ад нас хавалі нашу гісторыю? Што мы з яе ведалі? Тое, што адпавядала ідэалагічнай установцы на нейкім там этапе. Нас пазбавілі гістарычнай памяці.

Нельга патрабаваць нечага ў гэтым плане ад мясцовага кіраўніка, калі нават наша творчая інтэлігенцыя не зрабіла сур'ёзных захадаў, каб адзначыць 600-годдзе Грунвальдскай бітвы. А хто, як не яна, павінна задаваць тон у культурным жыцці краіны?

Многае залежыць ад грамадзянскай пазіцыі людзей. І такія знамянальныя даты неабходна адзначаць, бо яны абуджаюць нацыянальную свядомасць, фарміруюць чалавека-грамадзяніна, адкрываюць перспектыву на будучыню нацыі.

А Перамогу пад Грунвальдам я вырашыў адзначыць. Побач са сваёй хатай (на дачы) усталяваў памятны знак. Юбілейны год пасля 15 ліпеня не заканчваецца, і калі гэты знак захочуць перанесці на нейкае людное месца, то зроблена гэта будзе хутка і з вялікім задавальненнем.

Некалькі гадоў таму я даў у газетах абвестку, што хацеў бы купіць колы ад воза. Ахвотных прадаць было шмат, і я пабываў у вёсках Баранавіцкага, Ганцавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў. Але купіць тыя колы аказалася няпроста. Патрэбны былі колы старадаўнія і не вельмі спрошчаныя. А гаспадары паказвалі ад сялянскіх вазоў, часта моцна папсаваныя часам: гнілыя, разбітыя ці зусім спарахнелыя. І ўсё ж чатыры дубовыя колы купіць удалася. Са слоў старой жанчыны, ім гадоў пад сто і зроблены былі на вякі яе бацькам, але і іх давялося рэстаўраваць.

Для гарматы тыя колы падышлі выдатна, а зрабіць саму гармату было няцяжка, бо вопыт ужо быў. Няхай тая, першая, гармата і не зусім ўдалася, але дзякуючы ёй былі зроблены напрацоўкі, якія далі магчымасць пазбегнуць розных тэхнічных праблем.

Пад Грунвальдам гарматы былі яшчэ даволі прымітыўныя, бо артылерыя толькі выходзіла на «шырокую дарогу». Думаю, вялікай бяды не будзе, што мая гармата атрымалася на нейкае стагоддзе больш позняй.

На бетонна-каменную пляцоўку паставіў гармату, а побач усталяваў дзесяціметровы флюгер. Зрабіў гэта з некалькіх захадаў і то з дапамогай жонкі, бо тыя трубы хісталі ў розныя бакі — чым вышэй флюгер падымаўся, тым цяжэй яго было ўтрымаць. Але калі ў промнях вячэрняга сонца засвяціўся срэбны коннік, то гэта быў шчымлівы момант. І як тут не працытаваць славутыя радкі Максіма Багдановіча.

*У бязмерную даль вы ляціце,*
*А за вамі, прад вамі — гады,*
*Вы за кім у пагоню спяшыце?*
*Дзе шляхі вашы йдуць і куды?*

Вось такі атрымаўся памятны знак — што зроблена, тое зроблена.

Сёння, бліжэй да вечара, павінны зазірнуць знаёмыя і мы падымем келіхі. За наш Грунвальд!

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

# ЗМЕНЫ Ў РУХУ ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ НА ЎЧАСТКУ МІНСК—МАЛАДЗЕЧНА 19 ЛІПЕНЯ

У панядзелак, **19 ліпеня,** цэлыя суткі, пачынаючы ад 00:00 і да 23:40, прыгарадныя цягнікі **з Маладзечна** будуць хадзіць **толькі да станцыі Ждановічы** і назад. Як паведамілі ў аддзеле арганізацыі пасажырскіх перавозак Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, такія нязручнасці пасажырам давядзецца пацярпець у сувязі з **рамонтам моста** на перагоне Мінск Пасажырскі — Ждановічы.

Такім чынам, усе электрацягнікі з Маладзечна будуць ехаць толькі да станцыі Ждановічы. Наступныя электрацягнікі на ўчастку Маладзечна — Ждановічы **адмяняюцца**: (у **07:34** (Аляхн.), у **09:22** (Бел.), у **13:51** (Мал.), у **14:08** (Аляхн.), у **15:48** (Мал.), у **19:19** (Бел.), у **20:05** (Аляхн.).

Электрацягнікі са станцыі Ждановічы ў **06:24, 08:00, 10:19, 12:05,12:58, 18:08, 18:17** таксама **адмяняюцца** і будуць хадзіць па наступным раскладзе:

| Адпраўленне са ст. Ждановічы | Прыбыццё на канцавую станцыю |
|---|---|
| 0:40 | 2:02 |
| 4:54 | 6:07 |
| 5:53 | 7:17 |
| 6:53 | 8:23 |
| 7:26 | 8:15 |
| 7:51 | 9:17 |
| 8:47 | 10:16 |
| 9:32 | 10:59 |
| 11:41 | 13:08 |
| 13:51 | 15:18 |
| 15:51 | 17:18 |
| 16:56 | 18:24 |
| 17:45 | 18:35 |
| 18:02 | 19:32 |
| 18:48 | 20:16 |
| 19:36 | 21:03 |
| 20:32 | 21:21 |
| 21:02 | 22:28 |
| 22:19 | 23:42 |

Гэтыя электрацягнікі будуць спыняцца на станцыях у адпаведнасці са сваім раскладам, а электрацягнікі на 11:41 і 18:48 будуць спыняцца на ўсіх прыпынках.

У сувязі з такімі нязручнасцямі па дастаўцы пасажыраў 19 ліпеня будзе часцей хадзіць **гарадскі аўтобус № 44 «ГЦ Ждановічы — ДС Кульман»** раніцай з 05:45 да 10:20 і ўвечары з 16:30 да 21:00, а таксама будзе арганізаваны **спецыяльны аўтобусны маршрут ад станцыі Ждановічы да станцыі метро «Каменная Горка»**. Праезд у гэтым спецыяльным аўтобусе будзе ажыццяўляцца па чыгуначных білетах.

Расклад руху аўтобусаў паміж станцыяй Ждановічы і станцыяй метро «Каменная Горка»:

| Адпр. са ст. Ждановічы | Прыб. на ст. Метро «Каменная горка» | Адпр. Са ст. метро «Каменная Горка» | Прыб. на ст. Ждановічы |
|---|---|---|---|
| 05:47 | 06:07 | 00:10 | 00:30 |
| 06:44 | 07:04 | 04:24 | 04:44 |
| 07:12 | 07:32 | 05:23 | 05:43 |
| 07:31 | 07:51 | 06:23 | 06:43 |
| 08:10 | 08:30 | 06:56 | 07:16 |
| 08:54 | 09:14 | 07:21 | 07:41 |
| 09:35 | 09:55 | 08:17 | 08:37 |
| 10:23 | 10:43 | 09:02 | 09:22 |
| 11:27 | 11:47 | 11:11 | 11:31 |
| 12:50 | 13:10 | 13:21 | 13:41 |
| 14:23 | 14:43 | 15:21 | 15:41 |
| 16:40 | 17:00 | 16:26 | 16:46 |
| 18:27 | 18:47 | 17:15 | 17:35 |
| 19:30 | 19:50 | 17:32 | 17:52 |
| 19:57 | 20:17 | 18:18 | 18:38 |
| 20:23 | 20:43 | 19:06 | 19:26 |
| 21:22 | 21:42 | 20:02 | 20:22 |
| 22:27 | 22:47 | 20:32 | 20:52 |
| 22:58 | 23:18 | 21:49 | 22:09 |

Як адзначылі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, усе змены ў руху і раскладзе датычацца **толькі 19 ліпеня**, а ўжо з 20 ліпеня ўсё будзе як і раней.


## ИЗВЕЩЕНИЕ
**о повторном открытом аукционе на право заключения договора аренды земельного участка**
**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ВЕРХНЕДВИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

| | |
|---|---|
| **Адрес земельного участка, кадастровый номер участка** | Витебская область, Верхнедвинский район, Чапаевский сельсовет, поселок Чапаевский, У-2 кадастровый номер 221089213101000007 |
| **Ограничения в использовании участка** | На площади 3,7079 га – прибрежная полоса озера Освейское; На площади 0,0512 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| **Площадь земельного участка, га** | 3,7079 |
| **Назначение участка** | Для строительства дома охотника и рыболова |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 1 624 980 |
| **Сумма задатка, руб.** | 162 490 |
| **Расходы, связанные с формированием и регистрацией участка, проведением аукциона, руб.** | 1 857 440 (кроме того, расходы по размещению настоящего извещения в СМИ) |

**1. Аукцион состоится 23 июля 2010 г. в 15.00 в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний).**

**2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) по 22 июля 2010 г. (включительно) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 64. Заключительная регистрация участников 23 июля 2010 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.**

3. Сумма задатка перечисляется на р/счет 3641313000610 в ЦБУ № 206 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцка, МФО 660. Получатель – Верхнедвинский райисполком. УНП 300063038. Назначение платежа 04002.

4. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2010 г.

5. Контактный телефон в г. Верхнедвинске: 8 (02151) 5 28 97.



**На основании решения Могилевского горисполкома № 16—57 от 07.07.2010 г.**

**РЕОРГАНИЗОВАТЬ МОГИЛЕВСКОЕ ГОРОДСКОЕ КОММУНАЛЬНОЕ УНИТАРНОЕ ДОРОЖНО-МОСТОВОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ**

путем присоединения Могилевского городского коммунального унитарного дорожно-строительного предприятия.

*УНП 700444528*


# ПРЫВАТНЫЯ ЖЭУ — МАЛЕНЬКІ ПАРАСТАК?

**У Еўропе домакіраваннем займаюцца прыватныя кампаніі. Жыхары дома заключаюць дамову на абслугоўванне — і атрымліваюць пакет паслуг па эксплуатацыі свайго дома. У сярэднестатыстычнага, напрыклад, немца галава наконт капітальнага рамонту ці тэхнічнага абслугоўвання не баліць. Ён ведае, што калі яго не зробіць кампанія, якой ён плаціць грошы, то ён звернецца да іншай.**

Нягледзячы на цэнтральнае становішча ў Еўропе, эксплуатацыяй дамоў у нашай краіне займаюцца пераважна ЖЭУ ці таварыствы ўласнікаў. Ці ёсць у нас кампаніі, падобныя да еўрапейскіх?

Знайсці прыватныя кампаніі, якія б прапаноўвалі паслугі па кіраванні дамамі, — справа няпростая. Ва ўпраўленнях жыллёва-камунальнай гаспадаркі на маю слёзную гісторыю сваркі з ЖЭУ і просьбу параіць прыватную кампанію адказвалі наступным чынам: «Вы аўтаматычна падключаныя да сістэмы ЖКГ, як вы можаце самастойна нешта рабіць? Вам патрэбна жыць мірна і суіснаваць разам». Былі прапановы таксама ствараць таварыства ўласнікаў і самім абслугоўваць свой дом. «Шукайце свайго электрыка, сантэхніка і ўсіх астатніх», — адказалі мне ў адным са сталічных упраўленняў.



Адзін з дамоў, які абслугоўвае «ЖылЭкспА».

— У Беларусі на балансе ЖЭУ знаходзіцца 97 працэнтаў жылых дамоў, каля трох працэнтаў займаюць іншыя формы кіравання — ТУ, КІЗы, ЖБК і інш. І толькі зусім невялікую частку займаюць прыватныя кіруючыя кампаніі, — праясніў сітуацыю Генадзь Калёнаў, партнёр сумеснага праекта Беларусі і Еўрапейскага саюза «Жыллёвыя рэформы з удзелам насельніцтва». — У Беларусі іх налічваецца некалькі дзясяткаў.

## Прыватныя ЖЭУ — родам з Магілёва

Як ні дзіўна, найбольшая колькасць прыватных кампаній па абслугоўванні жылых дамоў (больш за 10) знаходзіцца ў Магілёве. Адна з самых папулярных у магіляўчан — ААТ «ЖылЭкспА». На балансе «ЖылЭкспА» цяпер 37 дамоў, з пяццю ёсць вусныя дамоўленасці.

— Мы заключаем дамову на поўнае тэхнічнае абслугоўванне. Прапаноўваем па сутнасці тыя ж паслугі, што і ЖЭУ, — кажа дырэктар кампаніі Іна Яўсеева. — Раней у нас была свая бухгалтэрыя. Бухгалтар разлічвала ўсе камунальныя паслугі, а пашпартыстка адсочвала ўпіску-выпіску. Але дамы ў нас знаходзяцца ў розных частках горада. Напрыклад, ёсць дом на адным канцы горада, яшчэ адзін — на другім, а трэці — пасярэдзіне. І вельмі нязручна людзям у офіс да нас ездзіць нават па простую даведку. А мы падлічылі, што для таго, каб пасадзіць бухгалтара, пашпартыста і арганізаваць графік працы з 8.00 да 20.00 без выхадных дзён, як гэта робяць разлікова-касавыя цэнтры, будзе вельмі выдаткоўна. Таму заключылі дамову з прадпрыемствам, якое займаецца менавіта бухгалтарскім улікам па камунальных паслугах і вядзеннем пашпартнага рэжыму. Яны вядуць і дамы ўсіх ЖЭУ і ЖСК, якія з імі заключаюць дамовы. Людзям туды звяртацца больш зручна. Таму само налічэнне камунальных паслуг вядзе ў нас разлікова-касавы цэнтр. А паказанні лічыльнікаў, нейкія іншыя лічбы падаём мы.

Акрамя прыбіральшчыц, дворнікаў, сантэхнікаў, электрыкаў ды столяраў у штаце арганізацыі ёсць свой галоўны інжынер, інжынер-энергетык.Таму па дапамогу дадатковых арганізацый «ЖылЭкспА» не звяртаецца. На ўсе нараканні, па словах Іны Яўсеевай, яны стараюцца рэагаваць аператыўна.

— Усё-ўсё добра не бывае, — расказвае Васіль Васільевіч, жыхар дома № 35 па праспекце Пушкіна, які абслугоўвае «ЖылЭкспА». — Дому нашаму 30 гадоў. І ў нас яшчэ больш-менш у параўнанні з іншымі. Святло ёсць, вада калі працякае, адразу прыходзяць і рамантуюць. Смецце вывозіцца... Праўда, моладзь на лесвіцы перашкаджае, але гэта ўжо іншае пытанне.

— Што я магу сказаць пра «ЖылЭкспА»? Я наведвала дамы, якія яны вядуць, была ў іх офісе. Складваецца ўражанне, што яны прыйшлі на рынак надоўга. Працуюць амаль без скаргаў ад жыхароў, — расказвае **Вольга ЗЯМЦОВА, начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёва**.

## Некалькі дзясяткаў на ўсю краіну

У адным з ЖЭУ на скаргу пачула такі адказ: «Калі ў цябе сто ратоў, як жа можна паспець кожнага накарміць?». Дзіўна, ЖЭУ не спраўляюцца са сваёй працай, а колькасць прыватных кампаній па ўсёй Беларусі не перавышае некалькі дзясяткаў. У чым жа прычына?

Сёння за тэхнічнае абслугоўванне аднаго метра квадратнага кліенты «ЖылЭкспА» плацяць 296 рублёў (сабекошт 1 м кв — 622,5 руб.). Плата за тэхнічнае абслугоўванне кватэры ў 60 м кв. складае цяпер 17 760 рублёў. Фактычна столькі ж, як і ў ЖЭУ. Але пры гэтым «ЖылЭкспА» недаатрымоўвае крыху больш за палову сумы. Павысіць суму да сабекошту кампанія не можа. Гэта рэгламентавана арт. 52 Жыллёвага кодэкса Беларусі, у якім сказана, што тарыфы і нормы адзіныя для дзяржаўнага і прыватнага жыллёвага фонду. Ды нават калі б быў такі дазвол, з-за павелічэння платы ўдвая ад кампаніі сышлі б усе кліенты.

— Для таго, каб пагасіць розніцу ў тарыфах, мы атрымліваем субсідыі з мясцовага фінансавага аддзела, — кажа Іна Яўсеева. — Тое, што грамадзяне недаплачваюць (тарыф жа фіксаваны), нам даплачвае мясцовы бюджэт. Прыбытак наш складаюць грошы за арэнду тэхнікі, за паслугі, якія выконваем для ўласнікаў кватэр, і г.д.

Пры гэтым сантэхнік у кампаніі атрымлівае 819 тыс. Гэта яго «голы» аклад. Дворнік атрымлівае 530 тыс. ( таксама без прэміі).

Па словах Іны Яўсеевай, прыбытку цяпер амаль няма. Гэта і зразумела. Таму што калі ў мясцовага бюджэту грошай не бывае, то ўвесь прыбытак ад арэнды і іншых паслуг ідзе на пакрыццё недаплаты ад жыльцоў.

— Калі б насельніцтва аплачвала 100 працэнтаў, то кошт тэхнічнага абслугоўвання кватэры ў 60 м кв. складаў бы 37 350 руб. у месяц. Нашы выдаткі на сёння на 11,3 % ніжэй. А значыць, нашы жыхары плацілі б 33 130 руб., — лічыць спадарыня Яўсеева. — Пры ўмове, што жыхарам не трэба прыбіраць пад'езд, напрыклад, ці яны робяць гэта самі, або яны вырашылі зменшыць колькасць лямпачак у пад'ездзе — кошт тэхнічнага абслугоўвання мог бы быць зменшаны.

— Шчыра кажучы, я вельмі чакаю, калі ўжо жыхары будуць плаціць сто працэнтаў за паслугі ЖКГ, — працягвае Іна Яўсеева. — Калі б плацілі 100 працэнтаў, то мы маглі б нашым грамадзянам прапаноўваць розныя варыянты абслугоўвання: адзін мінімальны — радзей нейкія рэчы рабіць і за меншыя грошы. І маглі б прапаноўваць больш паслуг і за іншыя грошы. Калі людзі будуць плаціць 100 працэнтаў, то яны змогуць выбіраць. Будзе нейкая альтэрнатыва. А сёння атрымліваецца, што нашы грамадзяне плацяць столькі ж, колькі і гарадское ЖЭУ. А вось па якасці.... Я думаю, усё ж мы горш за іх дакладна не працуем.

## «Нам патрэбны тысячы такіх кампаній»

— Увогуле, у гэтых арганізацый асноўная ідэя — ідэя выжывання, — кажа Генадзь Калёнаў. — Калі выбіраць нейкі бізнэс, то яўна не гэты, таму што ён фактычна не прыносіць прыбытку. На мой погляд, гэтыя людзі пайшлі ў бізнэс для таго, каб пры наступленні рынкавых адносінаў у сферы ЖКГ яны былі першымі. Яны і так будуць першымі, калі прыйдзе канкурэнцыя ў гэтую сферу.

Нашы прыватныя кампаніі пакуль далёкія ад еўрапейскіх аналагаў. Яны выконваюць розныя працы па эксплуатацыі дома, падаюць справаздачы. Аднак яны не займаюцца кіраваннем, як такім. Кіраванне ўключае ў сябе кіраванне фінансамі, іх выгаднае размяшчэнне, драбленне рахункаў у розных банках для выключэння рызыкі і г.д.

Еўрапейская практыка домакіравання — гэта вузкая спецыялізацыя. У Еўропе, прынамсі ў Германіі, адна кампанія па домакіраванні мае даччыныя маленькія кампаніі, якія прапаноўваюць вузкаспецыялізаваныя віды паслуг. Першая, напрыклад, выконвае толькі паслугі па домакіраванні, другая — па налічэнні плацяжоў, трэцяя прапаноўвае паслугі толькі пажылым людзям і г.д. А ў цэлым гэта адна вялікая кампанія.

У маштабах нашай краіны нам патрэбны тысячы такіх прадпрыемстваў. Яны павінны канкураваць паміж сабой. Пакуль іх дзясяткі нават такой формы. Гэта, вядома ж, вельмі мала. Калі б гэтых арганізацый было шмат, то таварыства ўласнікаў ці мясцовыя адміністрацыі маглі б аб'яўляць тэндары. Скажам, пяць арганізацый пададуць заяўкі на кіраванне, якая больш падыходзіць, тую і выбіраюць. Так адбываецца ў Германіі. У такім разе мясцовыя адміністрацыі атрымаюць канкурэнцыю, што ўжо само па сабе лепш, чым манаполія.

**Настасся ЗАНЬКО.**

# Топяцца ў ваннах, рэчках і нават у лужынах

**Выратавальная ў спёку вада аказалася смяротнай для 464 беларусаў. Па розных прычынах — нехта нырнуў, стукнуўся галавой аб дно і не змог выплысці, хтосьці палез у ванну і захлынуўся, кагосьці так і не паспелі выратаваць... Дзе лепей купацца? Чаго варта асцерагацца? Як зрабіць, каб купанне не стала трагедыяй, чытайце ніжэй.**

## Асноўныя тапельцы — п'яныя мужчыны

Па звестках Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах, больш за 70 адсоткаў тапельцаў — п'яныя мужчыны.

— Гэтыя ўтапленні звычайна адбываюцца ў месцы жыхарства. Свая рэчка, сваё возера. Да вады наша насельніцтва ставіцца вельмі бесклапотна, — кажа **Анатоль ГОЛУБ, старшыня рэспубліканскага савета РГГА «Беларускага таварыства ратавання на водах»**. — Вельмі нізкі ўзровень плавальнай падрыхтоўкі. Толькі 20 адсоткаў нашых грамадзян умеюць больш-менш плаваць, астатнія проста плёхаюцца. І пры гэтым чамусьці менавіта там, дзе няма выратавальнікаў, мы стараемся пераплываць рэкі і азёры. І заканчваецца ўсё непрыемнасцямі.

**ЛІЧБЫ**
*(па звестках таварыства ратавання на водах на 11 ліпеня 2010)*
Танула — **836 чалавек (з іх 142 няпоўнагадовыя)**
Загінула — **464 (43 няпоўнагадовыя)**
Падчас купання — **240**
Пры падзенні ў ваду — **124**
Падчас прыняцця ванны — **31**
У стане алкагольнага ап'янення — **238**
З прычыны прыступу хваробы — **32**
З-за недагляду бацькоў — **18**

Асноўнай праблемай мы лічым адсутнасць культуры і злоўжыванне спіртнымі напоямі. У асноўным топяцца мужчыны ад 20 да 45 гадоў у стане алкагольнага ап'янення. Нават бываюць выпадкі, калі людзі падаюць п'яныя ў лужыну і захлынаюцца. Пры ўвядзенні сухога закону ў Савецкім саюзе, як ні дзіўна, у Беларусі была самая маленькая колькасць тапельцаў — 560 чалавек. А зараз паглядзіце, што робіцца на Пцічы, якая каля Мінска. Указ аб распіцці піва там абсалютна не працуе... У Драздах, каля дамбы, дзе купацца катэгарычна забаронена, маладыя людзі на нашы заўвагі нецэнзурна лаяліся.

У Беларусі больш за 20 тыс. рэчак і азёраў, больш за 10 тыс. штучных вадаёмаў. Нават у дварах ёсць вадаёмы. Былі такія выпадкі, што і ў іх гінулі дзеці. Летась патанула 838 чалавек. Цяпер мы ідзём на тым жа ўзроўні.

## «Большасць топіцца моўчкі»

На працягу пяці хвілінаў чалавека патрэбна выратаваць з вады. Калі гэты час прайшоў, то да жыцця тапельца вярнуць ужо немагчыма.

— Гэтыя пяць хвілін чалавечага жыцця выратавальнікі трацяць на наступныя дзеянні, — расказвае Анатоль Голуб. — За 30 секунд людзі грузяцца ў катар, пасля 1-1,5 хвіліны праходзяць адлегласць зоны выратавання (ад 700 да 1000 м) і тры хвіліны застаецца вадалазу на тое, каб знайсці чалавека. Прычым вельмі складана адсачыць яго прыкладнае месцазнаходжанне. Асабліва калі тысячы людзей купаюцца. Таму што топяцца ў нас пераважна моўчкі. Добра, калі хто крычыць.

У нас цяпер 66 выратавальных станцый і 89 выратавальных пастоў. На кожнай станцыі дзяжурыць 14 чалавек: 5 вадалазаў, пяць матарыстаў, два медыкі і начальнік станцыі. А на пасту толькі дзяжурныя.

## З-за рэзкага ўваходжання ў ваду можа спыніцца сэрца

— Ёсць некалькі відаў утапленняў. Бываюць так званыя сапраўдныя ўтапленні, калі вялікая маса вады трапляе ў лёгкія. Гэта выклікае парушэнне дыхання, кісларод не паступае ў мозг і сэрца, — кажа **Вольга ШАРАНАВА, намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі**. — Ёсць асфіктычнае ўтапленне, калі ў лёгкія вада не трапляе. У такім выпадку бывае, што арганізм рэагуе спазмам. І рэзкае скарачэнне галасавой шчыліны не дае вадзе патрапіць у лёгкія. Але чалавек пакутуе ад вострай дыхальнай і сардэчнай недастатковасці. Ёсць таксама і сінкапальны стан. Ён узнікае з-за рэзкіх перападаў тэмпературы. У выніку можа быць парушэнне рытму сэрца і нават яго спыненне.

Досыць часта нашы пажылыя пацыенты і пацыенты з хранічнымі захворваннямі забываюць пра тое, што яны хворыя людзі. І не засцерагаюцца: сядзяць на сонцы, доўга не выходзяць з вады. З-за гэтага абвастраюцца хранічныя хваробы. Пры артэрыяльнай гіпертэнзіі можа быць нават інсульт ці інфаркт. Праблемы ўзнікаюць і з бранхіяльнай астмай, прыступы якой не купіруюцца інгалятарамі.

## Пры ныранні на мелкаводдзі — траўма шыі

— Самая распаўсюджаная траўма ў нырцоў — пашкоджанне шыйнага аддзела пазваночніка, — кажа **Андрэй МАЗУРЭНКА, кіраўнік лабараторыі траўматычных пашкоджанняў пазваночніка і спіннога мозгу РНПЦ траўматалогіі і артапедыі**.— Такая траўма асабліва частая, калі ныраюць на мелкаводдзі. Калі ў басейне для нырання прадугледжана глыбіня 4,6 м, то ў возеры ці рацэ яна значна меншая. Звычайна на гэта людзі не звяртаюць увагі і ныраюць усё роўна. Пры такой траўме чалавек не можа выплысці, ён нават варухнуцца не можа. У 50 адсотках выпадкаў настае смерць, а калі яшчэ злучаецца траўма з пнеўманіяй, то смерць надыходзіць у 100 адсотках. Самае важнае пры такой траўме — не старацца перамяшчаць чалавека. Бываюць выпадкі, што ў чалавека была траўма, якую можна выправіць за паўгода, а пасля няправільнай транспарціроўкі ён застаецца глыбокім інвалідам.

## Ратаваць варта да прыезду медыкаў

— Першую дапамогу тапельцу можа аказаць любы чалавек. І ад таго, наколькі правільна гэта будзе зроблена, залежыць выратаванне, — кажа Вольга Шаранава. — У інтэрнэце ёсць рэкамендацыі пра тое, што першапачаткова чалавека патрэбна пакласці папярок калена. Маўляў, абавязкова трэба выліць ваду з лёгкіх. І гэта лічыцца асноўным метадам выратавання. Але нават пры сапраўдным утапленні ў лёгкіх вады няма. Таму што яна адтуль умомант усмоктваецца ў арганізм. Перакладваючы тапельца праз калена, усе лічаць, што з лёгкіх выліваецца вада. Аднак такім чынам вада выліваецца са страўніка. Гэта трэба рабіць, бясспрэчна. Але калі мы бачым спыненне дыхання, то тут спярша варта рабіць штучную вентыляцыю лёгкіх і непрамы масаж сэрца. І не перапыняць да прыезду медыкаў. Таму што хуткая дапамога можа прыбыць да пацярпелага за 7-10 хвілін. Бо станцыі хуткай дапамогі, якія прымацаваныя да пляжаў, размешчаны не на саміх вадаёмах.

На жаль, людзі, што апынаюцца побач, не ведаюць, як аказваць такую дапамогу. І таму мая парада — адукацыя і практычныя ўрокі для ўсіх. Дзе іх можна прайсці? Пры кафедры хуткай медыцынскай дапамогі і медыцыны катастроф Беларускай дзяржаўнай акадэміі паслядыпломнай адукацыі арганізаваны спецыяльныя курсы для калектываў.

**Настасся ЗАНЬКО.**

**ПАРАДЫ:**

**1.** Купацца ў вядомых і правераных вадаёмах.
**2.** Заходзіць у ваду паступова, каб не было рэзкага ахалоджвання.
**3.** Абавязкова купайцеся пад кантролем людзей, якія добра ўмеюць плаваць.
**4.** Разлічвайце свае сілы, не імкніцеся пераплысці возера пасля доўгага перапынку.
**5.** Калі ў вас ёсць хранічная хвароба, перад пачаткам купальнага сезона пракансультуйцеся ў доктара.
**6.** Пастарайцеся не знаходзіцца паблізу вадаёмаў у п'яным стане.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## НА ТЭРЫТОРЫІ ЖЭУ-41 ПРАВЕДЗЕНЫ РЭЙД ПА ВЫКАНАННІ ПРАВІЛАЎ ВЫГУЛУ САБАК

**Работнікі ЖЭУ, а таксама прадстаўнікі ЖРЭА і Ленінскага РУУС падчас абходу дваровых тэрыторый выявілі тры парушэнні правілаў выгулу хатніх жывёл.**

Уладальнікі сабак не мелі пры сабе пакета і шufліка, на гадаванцах не было намордніка, а на ашыйніку жэтона, што з'яўляецца неабходным патрабаваннем, а ў адным выпадку сабака гуляў без павадка. Пры гэтым сабакаводы не ведалі, дзе размешчана бліжэйшая пляцоўка для выгулу.

На парушальнікаў складзеныя пратаколы, якія будуць перададзеныя на разгляд у адміністрацыю раёна. За падобныя парушэнні прадугледжаны папярэджанне або штраф да дзесяці базавых велічыняў. Дарэчы, у Мінску за студзень—чэрвень на ўладальнікаў сабак накладзены штрафы на агульную суму 3,5 мільёна рублёў.

**«Мінск—Навіны».**

# ХОЧАШ ВЫЖЫЦЬ? НЕ СПІ

**Канкурэнцыя не толькі ажыўляе рынак, але і з'яўляецца рухавіком эканомікі. І калі сёння наш рынак напоўнены разнастайнай прадукцыяй, то ў многім дзякуючы канкурэнцыі вытворцаў.**



Асабліва вострая канкурэнцыя сярод прадпрыемстваў, якія займаюцца перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі. Дастаткова паглядзець на прылаўкі, каб упэўніцца ў багацці і разнастайнасці прадуктаў харчавання — усё для пакупніка. Каб выжыць ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, неабходна не адставаць ад жыцця, выкарыстоўваць найноўшыя тэхналагічныя напрацоўкі, праводзіць мадэрнізацыю абсталявання, сачыць за канкурэнтамі.

Ляхавіцкі малочны завод — прыватнае прадпрыемства. Дзякуючы расійскаму капіталу тут была праведзена рэканструкцыя завода, устаноўлена новае абсталяванне, і прадпрыемства працуе стабільна.

Пра гэта мне даводзілася пісаць неаднаразова. Адным словам, хваліў ляхавіцкія малочныя прадукты як мог, а заадно і дырэктара завода Вячаслава Жукоўскага, бо ў станаўленні прадпрыемства ёсць і яго заслуга.

Пэўная колькасць кефіру, смятаны ды малака з Ляхавічаў пастаўляецца і ў крамы Баранавічаў, дзе ёсць свой малочны камбінат. Вось так і ўзнікла канкурэнцыя паміж гэтымі двума прадпрыемствамі. І гэта нармальная з'ява. Многія пакупнікі аддавалі перавагу прадукцыі ляхавіцкага завода, і не дзіўна, што ў горадзе імкнуліся нейкімі там захадамі прасоўваць найперш малочную прадукцыю баранавіцкага камбіната.

«Хіба мы не патрыёты свайго горада?» — даводзілася чуць у іншай краме.

Як было б далей, невядома, але неяк непрыкметна сітуацыя змянілася, і Баранавіцкі малочны камбінат пачаў адваёўваць страчаныя пазіцыі. А гэта даволі складана, бо пакупнік ужо прывык да тых ці іншых прадуктаў, у яго склалася сваё ўяўленне — гэтыя добрыя, а гэтыя кепскія.

Мая сям'я, як і некаторыя нашы знаёмыя, аддавала перавагу малочным прадуктам ляхавіцкага завода, бо яны былі добрай якасці. Але аднойчы давялося пачуць:

— А мы ўжо купляем смятану і кефір баранавіцкія, а ляхавіцкія нам не зусім падабаюцца.

Мы і самі прыкмецілі, што, бывае, купіш смятану з фірмовым знакам «Ляхавічок», а яна кіслая. Не хачу кідаць камень у бок Ляхавіцкага малочнага, бо адтуль прадукты маглі адправіць добрымі, але дарога, спякота, ды і ў краме паляжалі...

Каб разабрацца ў сітуацыі, патэлефанаваў дырэктару Ляхавіцкага малочнага завода Вячаславу Жукоўскаму, але размовы ў нас не атрымалася. На маю заўвагу наконт якасці прадукцыі ён адрэагаваў хваравіта. Хутчэй за ўсё, кіраўніку прадпрыемства падалося, што я сабраўся ганьбіць іх прадукцыю.

Крыўдаваць у гэтай сітуацыі не выпадала, бо ў кожнага з нас свой характар, амбіцыі...

Пасля той размовы я купіў малочныя прадукты баранавіцкіх вытворцаў і нечакана ўбачыў, што яны добрай якасці. Хоць раней яны не дужа падабаліся, асабліва кефір.

А вось што сказаў **дырэктар Баранавіцкага малочнага камбіната Віктар РАКУЦЬ**:

— *Жукоўскі — спрактыкаваны кіраўнік, пра прадукцыю ж Ляхавіцкага завода нічога кепскага сказаць не магу.*

— Гэта каб быць тактоўным?

— *Прычына не ў гэтым. За лепшае будзе, калі пра нашу прадукцыю будуць гаварыць пакупнікі. У кожнага чалавека ёсць схільнасць да прадукту, які яму найбольш падабаецца па смаку, паху, нехта дужа любіць малако вясковае, якое нагадвае яму пра дзяцінства. Няхай выбіраюць.*

— Згодзен, але, Віктар Іосіфавіч, у гэтым выпадку найперш цікавіць ваша прадукцыя. Якасць яе палепшылася.

— *А мы не спалі, а зрабілі стаўку на ўдасканаленне тэхналагічнага працэсу, замену абсталявання. Напрыклад, правялі мадэрнізацыю апаратнага цэха, і гэта дало станоўчыя вынікі.*

Бадай гэтым усё сказана — у канкурэнтнай барацьбе выжывае мацнейшы, і спажывец у гэтым рынкавым супрацьстаянні зацікаўлены.

Дастаткова пахадзіць па рынку, каб выбраць адзін і той жа тавар па больш нізкай цане. Вытворцы і прадаўцы хочуць выжыць, і таму даводзіцца маніпуляваць цаной. А калі цана на аднатыпныя малочныя прадукты амаль аднолькавая, то даводзіцца ўвагу пакупніка прыцягваць якасцю. І спажывец вельмі аператыўна рэагуе на змены.

І калі сёння прадукцыя ідзе нарасхват, то заўтра на яе пакупнік можа і не зірнуць — канкурэнты побач.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**


**РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ДОКШИЦКОГО РАЙПО**

- здание конторы с инв. № 232/С-18072, пл. 388,7 кв.м, по адресу: Витебская область, г. Докшицы, пл. Полевого, д. 1А с начальной ценой продажи 120 868 250 рублей с учетом НДС, задаток 12 086 825 рублей. Для обслуживания здания конторы выделен земельный участок пл. 0,0650 га.

Аукцион состоится **11 августа 2010 года в 11.00** по адресу: Витебская область, Докшицы, ул. Полевого, 2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни до 17.00 по 10.08.2010 г. включительно по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.

Официальное извещение опубликовано в бюллетене «Конкурсные торги в Беларуси и за рубежом» от 03.11.2009 г. № 41, в газете «Народнае слова» от 20.04.2010 № 43.

**С порядком проведения аукциона можно ознакомиться на сайте www.Ocenka.by.**
**Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02.**



**ОАО «МИНСКИЙ ПРИБОРОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:**

**Лот 1.** Пресс ручной винтовой, 1960 г.в., начальная цена 105000 руб. с НДС.

**Лот 2.** Токарный центр. станок до 250 мм, 1980 г.в., начальная цена 783000 руб. с НДС.

**Лот 3.** Токарный центр. станок более 320 мм, 1981 г.в., начальная цена 1151000 руб. с НДС.

**Лот 4.** Специальный вертикально-сверлильный станок, 1990 г.в., начальная цена 634000 руб. с НДС.

**Лот 5.** Широкоуниверсальный фрезерный станок, 1990 г.в., начальная цена 6380000 руб. с НДС.

**Лот 6.** Вальцы гибочные и правильные, 1970 г.в., начальная цена 800000 руб. с НДС.

**Лот 7.** Станок для намотки катушек, 1992 г.в., начальная цена 1028000 руб. с НДС.

Место расположения предметов аукциона: г. Минск, пр. Независимости, 58.

Задаток в размере 5 % от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840. Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Всю необходимую информацию, а также условия проведения аукциона можно получить по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Контактный телефон **8(017) 293 94 33.** Факс **293 94 40.**

Аукцион состоится **16 августа 2010 г. в 13.00** по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 12 августа 2010 г. до 16.00.**

УНП 100363840.



Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН серии БЛ № 0799180 считать недействительным.

## СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

Асаблівы ўдар у тэнісе
Парода паляўнічых сабак
Важкі доказ невінаватасці
Гатунак трывалай паперы
Самы лёгкі газ
Горная сістэма ў Сібіры
Асноўная адзінка даўжыні
Горад у Гродзенскай вобласці
Пярэдняя зала ў кіно, тэатры
Сузор'е Паўднёвага паўшар'я
Звычайнае сялянскае жыллё
Паўзучая споравая лясная расліна



Правіцель у некаторых краінах поўдня
Памяшканне для навуковых доследаў
Мужчынская спадніца ў шатландцаў
Афіцэрскае званне
Самая яркая зорка ў сузор'і
Дрэва з гронкамі дробных ягад
Дадатковы падатак на масавыя тавары
Хімікат супраць насякомых
«Сялянскі патрыярх» (англійскі паэт)
Падводны хрыбет паблізу Чылі
Член рабочай партыі ў Вялікабрытаніі
Праграма Беларускага тэлебачання
Горад-порт у Йемене
У граматыцы: катэгорыя дзеяслова
Востраў-курорт у Італіі
Горад на Сахаліне
Імя і псеўданім Дарашэвіча («Сахалін (катарга)»)
Раман Т. Драйзера
Абарыген вострава Хакайда
Мараплавец — даследчык Арктыкі
Аповесць «Слова Арата» (аўтар)
Надпіс на кінакадры
Балеты «Жызэль», «Карсар» (аўтар)
У старой Грэцыі — лічыльная дошка
Венгерскі хімік-аналітык
Хваёвы куст ці дрэўца сямейства кіпарысавых



| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | | | 7 | | 5 | | 3 | 2 |
| 4 | | | | | | | | 7 |
| 7 | 3 | | 2 | | 8 | | | 6 |
| 3 | | 8 | | 9 | | 7 | | |
| | 7 | | | | 4 | | | |
| 9 | 5 | | | | 2 | | | |
| | | | 4 | | | | 6 | 9 |
| | | | 9 | | | | 5 | |
| | | 9 | | 5 | | 8 | | 4 |

**СУДОКУ.** У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.


BelSwissBank
БЕЛОРУССКО-ШВЕЙЦАРСКИЙ БАНК

Наименование банка:

ЗАО «Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 года

(в млн. белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2010 г. | 01.07.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 28 835,5 | 25 300,6 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 17 327,8 | 10 407,7 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | 25 707,4 | 4 250,0 |
| | для торговли | 11031 | 198,4 | 198,3 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | 25 509,0 | 4 051,7 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 102 681,6 | 49 632,4 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 13 596,7 | 5 240,0 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 15,0 | 15,0 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 53 136,1 | 30 978,8 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 19 461,8 | 19 413,0 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 260 761,9 | 145 237,5 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | - | - |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 46 775,4 | 33 853,6 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 129 018,9 | 71 072,8 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 38,4 | 98,5 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 863,7 | 2 838,3 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 176 696,4 | 107 863,2 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 58 396,3 | 26 400,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 3 516,9 | 4 081,6 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 2 890,8 | 1 419,2 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 19 261,5 | 5 473,5 |
| 24 | Всего капитал | 121 | 84 065,5 | 37 374,3 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 260 761,9 | 145 237,5 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА ПО ВНЕБАЛАНСОВЫМ СЧЕТАМ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 98 779,7 | 50 746,2 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 91 523,7 | 54 163,1 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 года

(в млн. белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2010 г. | 01.07.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 3 020,6 | 1 272,6 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 911,3 | 2 300,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 109,3 | -1 028,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 8 551,5 | 5 881,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 907,9 | 611,7 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 7 643,6 | 5 269,7 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 8 762,7 | 8 191,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 28,3 | 71,9 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | 1,8 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 191,6 | 61,7 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 4 407,6 | 1 323,8 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 12 668,2 | 9 297,4 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 4 067,7 | 667,0 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 1 052,2 | 776,8 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 971,8 | 3 027,7 |

Председатель Правления В.А. Казбанов

Главный бухгалтер И.И. Трепашко

Лицензия Национального банка РБ на совершение банковских операций № 7 от 29.12.2008 г.


## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.57 | 21.34 | 16.37 |
| Віцебск — | 4.39 | 21.31 | 16.52 |
| Магілёў — | 4.47 | 21.24 | 16.37 |
| Гомель — | 4.52 | 21.12 | 16.20 |
| Гродна — | 5.13 | 21.47 | 16.34 |
| Брэст — | 5.23 | 21.40 | 16.17 |

**Месяц**
*Першая квадра 18 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**
*Пр. Ювеналія.*
*К. Генрыха, Давіда, Уладзіміра.*



Фота Сяргея АЛЯКСАНДРАВА.




## 15 ліпеня

Дзве даты

**1240 год** — ноўгарадскі князь Аляксандр разбіў войска шведаў на беразе Нявы, у вусці ракі Іжора. Шведамі камандаваў будучы кароль Ярл Біргер. Згодна з легендай, Аляксандр асабіста прымаў удзел у бітве, «самому королю възложи печать на лице острымь своимь копиемь» (аднак у шведскай хроніцы Эрыка XIV ст. пра гэты паход Біргера наогул не ўзгадваецца). Лічыцца, што пасля гэтага рускага князя сталі называць Неўскім.



**1606 год** — нарадзіўся Харменс ван Рэйн Рэмбранд, славуты нідэрландскі жывапісец, афартыст, партрэтыст («Начны дазор», «Святое сямейства», «Вяртанне блуднага сына»). Памёр у поўнай галечы.

Цытата дня:

*«Сапраўдны аптымізм грунтуецца не на тым перакананні, што ўсё будзе добра, а на тым, што не ўсё будзе дрэнна».*

**Жан Дзютур (нар. 1940), французскі пісьменнік.**

## Факт

## МАЛАНКА СМЯРОТНА ТРАЎМАВАЛА ПАСТУХА

### Некалькі чалавек пацярпелі з-за падзення дрэў

**Вецер, парывы якога дасягалі ў мінулы аўторак да 23 метраў у секунду, а таксама навальніца і дождж нарабілі бяды на тэрыторыі краіны: акрамя таго, што быў пашкоджаны шэраг будынкаў у некаторых населеных пунктах, пацярпелі і людзі — паблізу вёскі Зялёны Сад Гомельскага раёна на летняй пашы загінуў пастух калектыўнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Чырвоны Маяк».**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь Навіцкі, пастух быў смяротна траўмаваны разрадам маланкі. А ў Мінску на вуліцы Разінскай, 5 і завулку Горным, 3 два чалавекі атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці, трапіўшы пад дрэвы, якія паваліліся. Таксама з-за падзення верхавіны дрэва ў Лідскім раёне пацярпеў дзевяцігадовы хлопчык. Дзіця і яго бацькі адпачывалі ў лесе паблізу вёскі Сялец, калі адбылося гэтае здарэнне. Хлопчык з траўмамі змешчаны ў бальніцу.

У Мінску ў выніку падзення дрэў механічныя пашкоджанні атрымалі восем легкавых аўтамабіляў. Яшчэ адно паваленае дрэва па праспекце газеты «Звязда», 55 заблакавала выезд з тэрыторыі Гарадской станцыі медыцынскай дапамогі. Па вуліцы Кіжаватава, 78 паваліліся будаўнічыя лясы і заблакавалі выхад з крамы «Аўтазапчасткі», у якой знаходзіліся чатыры чалавекі. У абодвух выпадках выратавальнікі аператыўна прыйшлі на дапамогу людзям.

Наогул жа, з-за навальніцы, ветру і дажджу, паводле аператыўных звестак, у аўторак пацярпелі 57 населеных пунктаў у 22 раёнах Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей і Мінску. Былі пашкоджаныя дахі 50 жылых дамоў, 99 сельскагаспадарчых будынкаў, абясточаны 341 населены пункт.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### З БЕНЗАПІЛОЙ НА ЖАНЧЫНУ

**Кобрынскія міліцыянеры завялі крымінальную справу на беспрацоўнага з в. Луцэвічы.**

31-гадовы мужчына позна ўвечары завёў бензапілу і нанёс ёю рэзаныя раны жанчыне з гэтай жа вёскі. Бензапілу забралі.

### АБАКРАЎ СЯСТРУ

**У беспрацоўнай з в. Сталовічы, што пад Баранавічамі, прапала 8 залатых ювелірных вырабаў. Хто і калі ўкраў тое золата, жанчына сказаць не магла.**

Увагу аператыўнікаў прыцягнуў брат пацярпелай, які і прызнаўся, што абакраў сястру.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 24 (356)

## Хто нашкодзіў каліне?

**Белыя шапкі кветак каліны за лета ператвараюцца ў гронкі ягад, пакуль зялёных, а да восені каліна ў зялёна-чырвонай сукенцы, бы тая гордая прыгажуня, усміхаючыся, гаворыць: есці мае ягады яшчэ ой як рана. Гэтая прыгажуня з задавальненнем падстаўляе сонцу свае бакі з ягадамі, каб людзі, якія паклапаціліся пра яе з вясны, маглі пачаставацца пладамі. Але вось няўдача, каліна засмуцілася, панікла — ёй не даюць пакою шкоднікі, якія то лісты абгрызаюць, то на ягады замахваюцца. Відаць, гаспадар усё ж забыўся пра вернага доктара. Дык хто ж дакучае каліне? Найбольшую шкоду наносіць тля і калінавы лістаед.**

Супраць тлі рана вясной, калі толькі пачынаюць распускацца лісцікі, каліну рэкамендуюць апрацоўваць прэпаратамі «Актэлік», «Іскра», «Фуфанон», «Актара». Перад цвіценнем таксама не забудзьцеся пра каліну, апырскайце настоямі палыну, шалупіння цыбулі, перцу горкага, часнаку, тытуню.

Такі паганы шкоднік як калінавы лістаед жыве, харчуецца і размнажаецца толькі на каліне. Увосень самкі адкладваюць яйкі ў маладыя парасткі. Увесну пры распусканні пупышак адраджаюцца лічынкі, якія адразу ж пачынаюць паядаць лісты. У першай дэкадзе чэрвеня яны акукліваюцца, а праз месяц з кукалак выходзяць жукі. Жукі харчуюцца спачатку лістамі, абгрызаючы іх ад краёў да жылак, а затым маладымі завязямі і парасткамі. Апрацоўку праводзяць у два этапы — супраць лічынак у маі—чэрвені і супраць жукоў у ліпені-жніўні, выкарыстоўваючы тыя ж прэпараты, што і супраць тлі.

Прадухіліць развіццё калінавага лістаеда вы можаце, выкарыстоўваючы асаблівасці яго развіцця. Самкі адкладваюць яйкі ў вярхушкі парасткаў, у выніку чаго парасткі засыхаюць. Таму ўвосень ці вясной да адраджэння лічынак выражце і спаліце засохлыя парасткі.

Калі на каліне асыпаюцца ягады, хутчэй за ўсё іх падкусваюць мурашы, прычым зразаюць крайнія — гэта значыць, самыя буйныя. Абмяжуйце мурашам доступ на каліну — і праблем не будзе. Зрабіць гэта можна, абмазаўшы ствол «мышыным» клеем.

## Мардоўнік-доктар, меданос

**Спакон веку лекары выкарыстоўвалі лекавыя ўласцівасці мардоўніку для лячэння многіх хвароб: эпілепсіі, рассеянага склерозу, валляка, атэрасклерозу, паралічу. Мардоўнік аднаўляе эластычнасць і гібкасць сценак крывяносных сасудаў, рухальныя функцыі, выкліканыя парушэннямі нервовай сістэмы арганізма. Ён валодае танізуючым і агульнаўмацавальным дзеяннем. Мардоўнік даурскі прымяняецца ў кітайскай медыцыне ў якасці кроваспыняльнага сродку.**



Гэта шматгадовая травяністая расліна, яна дасягае двухметровай вышыні. Цвіце мардоўнік усё лета, з чэрвеня па жнівень. Гэта вельмі каштоўны меданос. Прадуктыўнасць мардоўніку — да 1700 кг мёду з гектара ў год.

Мардоўнік засухаі марозаўстойлівы. Догляд яго летам зводзіцца да некалькіх прапалак і нячастых паліваў. У канцы жніўня — пачатку верасня можна збіраць лекавае насенне. Зрэзаць ножніцамі, раскласці ў цяні на прасушванне, захоўваць у мяшочках.

Настойку мардоўніку гатуюць так: насенне насыпаюць у шкляны посуд, заліваюць гарэлкай або спіртам у суадносінах 1:10, настойваюць не менш чым два месяцы. Прымаюць па чайнай лыжцы раніцай да яды на працягу двух месяцаў, потым робяць 10-дзённы перапынак, і пры неабходнасці паўтараюць двухмесячны курс лячэння.

Расліна таксічная. З аднаго боку, лячэнне травамі — гэта добра, і здаецца бясшкодным. Аднак заўсёды неабходна вытрымліваць строгія дозы, лячыцца пад наглядам урача.

Мардоўнік — вельмі дэкаратыўная расліна. Ён паспяхова расце ў паўцяністым месцы, цудоўна ўпрыгожыць сціплы куток саду сваёй магутнай лістотай з эфектнымі шарамі-суквеццямі. Наземная частка мардоўніку — выдатнае арганічнае ўгнаенне, багатае на калій і разнастайныя мікраэлементы, таму выкарыстоўваецца для прыгатавання кампосту.

## Малако супраць фітафторы

Паскоранаму размнажэнню ўзбуджальніка фітафтарозу садзейнічае ўмерана цёплае надвор'е з вялікай колькасцю ападкаў пры рэзкіх ваганнях начных і дзённых тэмператур. Тэрмінова прыміце меры для прадухілення масавага з'яўлення хваробы. Спецыялісты раяць для прафілактычнай апрацоўкі пасадак, напрыклад бульбы, выкарыстаць найбольш простыя і недарагі сродак — азафос. Апрацаваныя ім расліны атрымліваюць яшчэ і пазакаранёвую падкормку. Апырскванне азафосам эфектыўнае толькі як прафілактычная мера.

Апрацоўку памідораў супраць фітафторы трэба пачынаць загадзя, не чакаючы, пакуль яна праявіцца. Ужо з пачатку ліпеня можна раз у тыдзень паліваць памідоры вадой з малаком (на 8 л вады 0,5 л малака, можна браць яго крыху больш). З хімічных прэпаратаў для апырсквання прыгодныя ўсе прэпараты, якія змяшчаюць медзь: хлорвокіс медзі, медны купарвас, медэкс, бардоская вадкасць, аксіхом, купраксат, цынеб і многія іншыя. Выкарыстоўваць іх трэба згодна з інструкцыяй, захоўваючы ўсе меры перасцярогі.

Напрыклад, апрацоўку прэпаратам аксіхом трэба праводзіць блокам, гэта значыць, мінімум два разы, адну за другой. Толькі пры такім прымяненні ў поўнай меры могуць праявіцца сістэмныя якасці прэпарата. Апырскваць трэба маладыя расліны ў час іх актыўнага росту, паколькі менавіта на гэтай стадыі яны лепш за ўсё рэагуюць на гэты прэпарат. Інтэрвал паміж апрацоўкамі павінен складаць 10—12, максімум 14 дзён.

Існуе шмат іншых прэпаратаў, якія трэба ўмела прымяняць у барацьбе з гэтым захворваннем.

Звычайна агароднікі цяпліцу адчыняюць удзень і зачыняюць на ноч. Такім чынам, пры начным паніжэнні тэмпературы і адсутнасці эфектыўнай вентыляцыі ствараюцца ўмовы для выпадзення расы на лісці раслін, нават на кончыках звісаюць яе кропелькі. А фітафторы толькі гэта і трэба. Паспрабуйце зрабіць усё наадварот: на ноч усе форткі і фрамугі адчыніць, забяспечваючы максімальнае праветрыванне. Сухое паніжэнне тэмпературы ўначы не пашкодзіць раслінам. У час цвіцення пры дапамозе фортак і фрамуг падтрымлівайце ў цяпліцы тэмпературу 20—25 градусаў. У перыяд росту пладоў і іх выспявання форткі і фрамугі зачыняйце, каб тэмпература трымалася на ўзроўні 30—35 градусаў. Пры такім рэжыме плады таматаў хутчэй выспяваюць, а таксама хутчэй набіраюць масу.

## Калі і як убіраць

Гэта пытанне цікавіць не толькі навічкоў, але і бывалых агароднікаў. Тэрміны ўборкі залежаць у першую чаргу ад умоў надвор'я, гатунку той ці іншай агародніны. Калі ў даўніну прырода сама вырашала, калі садзіць, а калі сеяць, то цяпер многае змянілася: разнастайнасць гатункаў, мноства розных хвароб і шкоднікаў. Многія агароднікі сталі аддаваць перавагу раннім гатункам, выкарыстоўваць укрыўныя матэрыялы, аднак і гэта не заўсёды патрэбнае выйсце. Таму летам па магчымасці сачыце за сваімі агароднымі надзеламі і старайцеся максімальна выкарыстаць вырашчаную там агародніну.

**Агуркі** ўбіраюць рэгулярна праз 2-3 дні, не допускаючы іх перарастання. Прычым у сонечнае надвор'е часцей, чым у пахмурнае. Асабліва інтэнсіўна растуць яны ў цёплыя ночы, калі тэмпература трымаецца на адзнацы 18—20 градусаў. Пры больш нізкай тэмпературы і нерэгулярных зборах ураджаю плоданашэнне запавольваецца.

**Кабачкі** збіраюць два разы на тыдзень, прыкладна праз 7 дзён пасля з'яўлення завязі. Стандартныя памеры — 15—20 см у даўжыню. Маладыя плады захоўваюць у поліэтыленавых пакетах пры 1—2 градусах да трох тыдняў. Іх можна разрэзаць на кружочкі, скласці ў харчовыя пакеты і замарозіць да вясны. Кабачкі, якія добра выспелі, можна захоўваць да трох месяцаў у пакаёвых умовах.

**Патысоны** ж, калі іх вытрымаць да поўнай біялагічнай спеласці, у ежу непрыгодныя. Іх пажадана збіраць у маладым узросце, пакуль яны мяккія, праз 4—6 дзён. Захоўваць у халадзільніку можна не болей за 10 дзён.

Даглядаць **таматы** больш складана і ў цяпліцы, і ў адкрытым грунце. Для лепшага цвіцення кусты злёгку ўстрэсваюць, а раніцай ці ўвечары праводзяць пазакаранёвыя апрацоўкі растворам борнай кіслаты (1 г на 1 л вады), а таксама 0,5-працэнтнай выцяжкай суперфасфату (5 г на 1 л вады). Калі кветачкі ападаюць, значыць, яны не апладніліся, або раслінам не хапае вільгаці і сілкавання. Падкарміце расліны, аддаючы перавагу фосфарным або калійным угнаенням. У гарачае надвор'е (больш як 28 градусаў) цяпліцы трэба абавязкова праветрываць. Выродлівыя плады трэба абрываць з куста, таму што яны перашкаджаюць выспяваць якасным. Калі на кустах сфарміруецца дастатковая колькасць таматаў, ужо ў пачатку жніўня прышчыкніце верхавінку высакарослых раслін, абарвіце кветкі, лішнія і хворыя лісты. Позныя завязі ўсё роўна не паспеюць сфарміравацца. У гэты час трэба паклапаціцца, каб расліны спынілі рост і ўсю сваю энергію аддалі для фарміравання і выспявання пладоў.

Каб скараціць паступленне пажыўных рэчываў, некаторыя агароднікі, узяўшыся рукамі за сцябло, асцярожна цягнуць расліну ўгору, пакуль слёгку не надарвуцца карані. У некаторых выпадках робяць падоўжаны надрэз сцябла на вышыні 12 см ад зямлі даўжынёй 5—6 см. У яго ўстаўляюць невялікі калок таўшчынёй 0,5 см. Абодва метады садзейнічаюць паскарэнню выспявання таматаў. Аднак імі карыстацца трэба тады, калі плады дасягнуць патрэбнай велічыні. Спелыя плады выдзяляюць газ этылен, які садзейнічае выспяванню таматаў. Таму не варта абрываць усе адразу, каб яны дапамагалі выспяваць іншым. У другой палове лета палівы ў цяпліцы скарачаюць, але трэба сачыць за аптымальнай вільготнасцю. У цяпліцы павінна быць суха.

Масавы збор пладоў пачынаецца ў канцы жніўня—верасні. Аднак не трэба дапускаць, каб тэмпература апускалася ніжэй за 8 градусаў. Пры 5 градусах таматы пачынаюць хварэць, а зялёныя малочныя плады губляюць здольнасць даспяваць.

**Баклажаны** трэба ўбіраць да таго як яны пачнуць мяняць афарбоўку і губляць характэрны бляск, гэта значыць, у стадыі тэхнічнай спеласці. Справа ў тым, што плады баклажанаў усіх гатункаў маюць горкі смак. У працэсе выспявання яго колькасць павялічваецца, і плады есці немагчыма з-за гаркаты. Зрэзаныя захоўваюць у халадзільніку, можна таксама замарозіць.

**Перцы** для засолкі і кансервавання ўбіраюць у стане тэхнічнай спеласці, якая настае праз 30—45 дзён пасля ўтварэння завязяў. Яшчэ праз 20—30 дзён перцы выспяваюць, набываючы характэрную для гатунку афарбоўку. Аднак, калі плады даўжэй застаюцца на кустах, менш завязваецца новых. Знятыя недаспелыя плады спачатку захоўваюцца пры тэмпературы 9—12 градусаў, пакуль яны не набудуць характэрны смак, а затым тэмпературу паніжаюць да 0—5 градусаў. Калі спачатку пакінуць нізкую тэмпературу, плады не выспяваюць, захворваюць і пакрываюцца цёмнымі плямамі. Пры тэмпературным рэжыме, які мы апісалі, перцы можна захоўваць 1,5—2 месяцы, а ў замарожаным выглядзе яны даляжаць да наступнага ўраджаю.

*(Працяг тэмы ў наступным выпуску.)*

## РОЛЯ ШАФЕРАЎ

**У структуры вясельнай урачыстасці роля шафера і шаферкі была найбольш прыкметнай у момант выкупу нявесты. У гэтым рытуале адбілася тая эпоха ў развіцці грамадства, калі існавала «ўмыканне нявесты», ці авалоданне ёю сілай, з дапамогай самых блізкіх сяброў — дружыны маладога. Такое рэха мінулага яшчэ і сёння можна ўбачыць на пачатковым этапе развіцця вяселля: шлях дружыне жаніха перакрываюць сталамі, а раней — бярвеннем, частакай плоту і г.д., імкнучыся спыніць яго рух і патрабуючы выкуп. На Беларусі гэты абрад зваўся «выкуп стала», ці «лоўля зайца». Дружкам жаніха неабходна было павітацца з радзінай і сябрамі нявесты, «прызначыць» цану, а дружкі нявесты не саступалі «тавар» адразу, а пачыналі гарэзліва «таргавацца».**

- Немалаважную ролю выконвалі дружкі і на працягу ўсяго вяселля. У некаторых рэгіёнах менавіта старшаму шаферу было даручана кіраваць вяселлем. Ад яго ўмення размаўляць, жартаваць, ад яго ведання абрадаў і рытуалаў залежала тое, наколькі ўдала пройдзе вяселле. Вельмі негатыўным было стаўленне да тых дружак, якія, выпіўшы зашмат за вясельным сталом, забываліся на свае абавязкі.
- Дружак, шафераў ці ганаровых сведак выбіраюць сярод самых блізкіх сяброў. Пры гэтым неабходна памятаць, што **ганаровую ролю шафераў на вяселлі можна выконваць толькі адзін раз у жыцці**, каб своечасова стварыць сваю сям'ю, у адваротным выпадку вы можаце нашкодзіць самому сабе — застацца шаферам назаўсёды: «Калі дзеўка ўжо была два разы дружкаю, то ўжо больш ніяк няможна».
- Шаферам і шаферкай могуць быць толькі незамужнія, нежанатыя маладыя людзі, якія не мелі сваіх дзяцей.
- У храме ў час вянчання абавязак шафера і шаферкі — трымаць вянцы над галовамі маладых.
- Яны павінны рассцяліць ручнік, на якім будуць стаяць маладыя, яны ж паднімуць яго пасля вянчання, каб больш ніхто не змог наступіць на іх дарогу жыцця і «перабіць» долю маладых.
- На працягу ўсяго вяселля шафер і шаферка павінны стаць аб'яднальным звяном паміж маладымі і ўдзельнікамі вясельнай урачыстасці. Іх абавязак — захаваць маладых ад непатрэбных кантактаў з удзельнікамі вяселля, дапамагаць у любых абставінах, спрыяць таму, каб маладых у час вяселля ніхто не мог «раз'яднаць», няхай нават на некалькі хвілін.
- І сёння жыццё прыносіць нам нямала «сюрпрызаў» нават з боку самых блізкіх людзей, якія рознымі спосабамі імкнуцца нарабіць шкоды маладой пары ў час вяселля. Менавіта пра гэта папярэджвалі нашы продкі: «дружкі пільнуюць, уся дружына глядзіць, і маладая таксама ўвесь час асцерагаецца, каб з вянка, які аздабляе яе галаву, не адшчыкнуў хто-небудзь лістка руты, бо ў такім разе не зможа яна ўжо зберагчы ніводнага з тых дзетак, якіх ёй наканавана мець» .

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

Я знайшла сабе хлопца. Разумнага, добрага, адданага і прыгожага і была такая шчаслівая!.. Пакуль разумны не даведаўся пра добрага, а адданы пра прыгожага...

☺

**Суседзі.**
**— Як жывеш?**
**— Нічым суцешыць не магу. Усё добра...**

☺

Суніцу ў лесе вырошчваюць камары, гэта прынада для людзей, на якіх яны такім чынам палююць.

☺

**— Доктар, я жыву з жанчынай у яе кватэры. Я прыбіраю, мыю посуд, раблю рамонт, прыношу дадому грошы, і калі ў яе ёсць настрой — займаюся з ёй сэксам.**

**Хто я: яе муж ці сужыцель?**
**— Вы — гастарбайтар!**




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3414. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12